www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта 17 кастрычніка 2007 года, № 15–16 (1966–1967)

СУПРАЦОЎНІЦТВА

СЛАВЯНСКАЯ АСАМБЛЕЯ

XI Міжнародная асамблея рэктараў славянскіх універсітэтаў прайшла ў БДУ з 8 па 11 кастрычніка. Такі форум у Беларусі праводзіўся ўпершыню.

Рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў і рэктар Дзяржаўнай акадэміі славянскай культуры Ала Канёнкава замацоўваюць падпісанне пагаднення аб супрацоўніцтве

Да нас з'ехаліся госці з Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Балгарыі, Сербіі, Македоніі, Славеніі, Славакіі і Балгарыі. У рамках асамблеі адбылася канферэнцыя "Культурная спадчына славянскіх народаў у сучасным свеце". Галоўнай яе мэтай стала засведчанне вялікай каштоўнасці славянскай культуры, часткай якой з'яўляецца і Беларусь, у эпоху глабалізму.

Падчас форуму была падпісана дамова аб супрацоўніцтве ў галіне навукі і адукацыі паміж БДУ і Універсітэтам Св. Кірылы і Мяфодзія з Скоп'е (Македонія). Вельмі важным стала заключэнне шэрагу пагадненняў аб супрацоўніцтве з Дзяржаўнай акадэміяй славянскай культуры, што адкрываюць шырокія магчымасці для навуковага і культурнага абмену.

У выніковым дакументе асамблеі гаворыцца: "Асаблівае значэнне пры выбары каштоўнасцяў сёння набывае захаванне моладдзю сваіх духоўных славянскіх вытокаў, прыярытэту духоўнаманаральнага жыццёвага пачатку над рацыянальна-прагматычным. Асновай гэтага з'яўляецца актыўнае далучэнне маладых да калектыўнай культурнай памяці славян, узаемная павага агульнаславянскіх і нацыянальных традыцый і святыняў".

Удзельнікі асамблеі падкрэслівалі ў сваіх выступленнях, што зараз выспела неабходнасць выпрацаваць праграмы дзейсных і рознабаковых захадаў па падтрымцы славянскай культуры. У многіх краінах свету даўно і актыўна дзейнічаюць цэнтры даследаванняў у галіне славістыкі. Патрэбна ствараць новыя навуковыя цэнтры і арганізацыі, якія будуць працаваць на карысць грамадства.

Для гасцей асамблеі была падрыхтавана шырокая культурная праграма з наведваннем Нацыянальнай бібліятэкі, Дома міласэрнасці ў Мінску, Мірскага замка і праглядам спектакля ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы. "Мы досыць глыбока пазнаёміліся з беларускай спадчынай, – адзначыла Ала Канёнкава, рэктар Дзяржаўнай акадэміі славянскай культуры. – Падчас візіту мы на свае вочы пабачылі беларускае мастацтва, жывапіс, архітэктуру і іншыя культурныя набыткі. У мяне, прынамсі, засталіся незабыўныя ўражанні, тым больш, што я прыехала ў Мінск упершыню".

Дарэчы, згаданая маскоўская ўстанова з'яўляецца галоўным ініцыятарам арганізаваных мерапрыемстваў, якія дагэтуль ладзіліся ў асноўным у Расіі і Балгарыі сумесна з іншымі дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі.

Ганна ЛАГУН
Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

"ВЫНІКІ РАБОТЫ БДУ Ў 2006/2007 НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДЗЕ І ЗАДАЧЫ НА 2007/2008 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

З даклада рэктара БДУ прафесара Васіля СТРАЖАВА

Стар. 2–3

ВЫНІКІ ПРЫЁМНАЙ КАМПАНІІ–2007 У БДУ

Стар. 5

У ВІРЫ ТЭАТРАЛЬНАГА ЖЫЦЦЯ

Чацвёрты раз у Мінску праведзены фестываль "Тэатральны куфар"

Стар. 8

ДАСЯГНЕННІ

МЕДАЛЁВЫ ЎРАДЖАЙ НАВУКІ БДУ

Восем залатых і чатыры срэбных медалі, а таксама чатыры дыпломы атрымала навукова-тэхнічная прадукцыя БДУ на XII Міжнароднай выставе-кангрэсе "Высокія тэхналогіі. Інавацыі. Інвестыцыі", якая праходзіла ў Санкт-Пецярбургу з 2 па 5 кастрычніка.

На конкурс ад БДУ было пададзена 16 праектаў, і ўсе яны адзначаныя высокімі ўзнагародамі.

"Золата" дасталася наступным распрацоўкам: шумамер-аналізатар М-105, універсальныя сістэмы сілкавання "Міленіум" – "Нюанс"; хуткадзейная фотапрыёмная прылада з шырокім дынамічным дыяпазонам; проціпухлінны прэпарат "Цысплацел"; мабільная аўтаномная водаачышчальная прылада (МАВАП); комплексны прадукт харчавання прафілактычнага прызначэння, узбагачаны біядаступным селенам (булачка з паляпшальнікам "Фрыгорыі-4" і сасіска "Аўрора-7"); біяхімічныя наборы рэагентаў для маркіроўкі і ідэнтыфікацыі каштоўных папер і дакументаў; набор рэагентаў для імунаферментнага вызначэння агульнага ўтрымання афлатаксінаў у сыраватцы крыві чалавека, прадуктах харчавання і навакольным асяроддзі.

"Срэбра" атрымалі заліванча-змяшальнае абсталяванне нізкага ціску са статычным і статыка-дынамічным змешваннем палімерных кампазіцый; абсталяванне для нанясення аднакампанентных палімерных сістэм і клеяў; фітакампазіцыя "Лотас" і прадукцыя з яе прымяненнем (хлеб "Энергія"); тэхналогія атрымання шматслойнага тэрмастойкага пакрыцця на аснове нікелю.

Дыпломамі ўзнагароджаныя: тэрмастойкія матэрыялы на аснове неарганічных клеявых кампазіцый; тэрмаіндыкатар якасці гартавальных асяродкаў (ТЯГА); тэхналогія і абсталяванне мікрахвалевай сушкі і стэрылізацыі, а таксама універсальны раствор для стварэння плат метадам вытраўлення.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

СВЯТКАВАННІ

ШАНАВАННЕ МІЛЫХ МАМ

Дабрачыннай акцыяй "Мы памятаем вас" распачалося ў БДУ святкаванне Тыдня маці. 8 кастрычніка да былых супрацоўніц універсітэта – ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны завіталі з падарункамі прадстаўніцы Саюза жанчын БДУ на чале са Святланай Савінай.

Маладыя мамы разам з арганізатарамі сустрэчы і гасцямі рэктарата

10 кастрычніка ўпершыню ў Белдзяржуніверсітэце былі ўшанаваныя маладыя мамы – студэнткі і аспіранткі, якія паспяхова сумяшчаюць вучобу з нараджэннем і выхаваннем дзетак. Пятнаццаць з іх сабраліся ў рэктараце, дзе ў нефармальнай атмасферы, за гарбатай, атрымалі віншаванні і падзяку ад рэктара Васіля Стражава. А намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны нашай краіны Марына Шчоткіна і намеснік старшыні Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раман Дапіра далі карысныя парады ў дачыненні належных маці-студэнтцы льгот і сацыяльнага абслугоўвання. Удзельніцы Мінскага міжнароднага клуба жонак паслоў і дыпламатаў падзяліліся з дзяўчатамі сваім досведам у выхаванні дзяцей, а самі гераіні свята распавялі пра складанасці разбурэння стэрэатыпу маці як жанчыны, жыццё якой прысвечана выключна побыту і дзецям. Асаблівую павагу выклікалі мнагадзетныя маці, напрыклад, Аксана Ключнікава – студэнтка III курса факультэта журналістыкі, якая выхоўвае чацвёра дзяцей. Калі яна падорыць жыццё пятаму, то атрымае ордэн Маці і грашовую суму ў пяць бюджэтаў пражытачнага мінімуму, а яшчэ пэўную дапамогу ад мясцовых улад – менавіта так, паводле Марыны Шчоткінай, дзяржава матэрыяльна заахвочвае жанчын паляпшаць дэмаграфічную сітуацыю ў краіне. Айцец Аляксандр ад імя праваслаўнай Царквы нагадаў усім пра адвечнае прызначэнне жанчыны – нараджаць і выхоўваць наступнае пакаленне. Што да кіраўніцтва БДУ, яно, па словах Васіля Стражава, з радасцю ідзе насустрач маладым бацькам-студэнтам і намагаецца арганізаваць жыццё універсітэта такім чынам, каб стварыць спрыяльныя ўмовы для іх навучання. Да цёплых слоў і падарункаў прыклалася і матэрыяльная падтрымка – на рахункі мам будуць пераведзены па сто тысяч для кожнага дзіцяці.

А 12 кастрычніка рэктар трымаў урачысты прыём "Мацярынскае вечера" ў гонар маці таленавітых студэнтаў універсітэта і студэнтаў-лаўрэатаў спецыяльных фондаў Прэзідэнта краіны. Пасля госці прайшлі з экскурсіяй па універсітэцкім дворыку, наведалі музеі. Завяршылася святкаванне цудоўным канцэртам у Ліцэі БДУ.

Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ
Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

ПАДЗЕЯ

З'ЕЗД ВУЧОНЫХ

З 1 па 2 лістапада 2007 г. у Мінску ў Палацы рэспублікі пройдзе I з'езд вучоных Беларусі.

У яго рабоце возьме ўдзел дэлегацыя Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў складзе 128-мі чалавек на чале з рэктарам прафесарам Васілём Стражавым. Напачатку ўсе ўдзельнікі з'езда наведаюць выставу навукова-тэхнічнай прадукцыі БелЭКСПА, а пасля размяркуюцца па профільных міністэрствах. Частка гасцей накіруецца ў БДУ, дзе іх будзе чакаць сустрэча з кіраўніцтвам. Затым яны пазнаёмяцца з Музеем гісторыі БДУ, а таксама Музеем землязнаўства на геаграфічным факультэце. Уся работа вучоных будзе весціся па 7-мі секцыях, адна з якіх (па біялогіі) пройдзе на базе Ліцэя БДУ.

На пленарным пасяджэнні 2 лістапада перад удзельнікамі з'езда выступіць Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка. Акрамя таго, на трыбуну выйдуць старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Міхаіл Мясніковіч і старшыня ДКНТ Уладзімір Мацюшкоў. Па выніках з'езда будзе прынята рэзалюцыя.

УРАЧЫСТАЕ ПАСЯДЖЭННЕ

29 кастрычніка адбудзецца ўрачыстае пасяджэнне Вучонага савета БДУ, прысвечанае 86-й гадавіне універсітэта. На наступны дзень, 30 кастрычніка, у Палацы спорту для студэнтаў будзе зладжана дыскатэка з канцэртнай праграмай.

УНІВЕРСІТЭТ

17 кастрычніка 2007 года, № 15–16 (1966–1967)

АФІЦЫЙНА

ВЫНІКІ РАБОТЫ БДУ Ў 2006/2007 НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДЗЕ

З выступлення рэктара Беларускага дзяржаўнага універсітэта прафесара Васіля СТРАЖАВА на пашыраным пасяджэнні Вучонага савета БДУ 24 верасня 2007 года

Слайд 1

Звесткі пра колькасць работнікаў БДУ на 1.09.2007

падраздзяленне	на пастаяннай аснове			знешнія сумяшчальнікі			унутраныя сумяшчальнікі		
	разам	д/навук	к/навук	разам	д/навук	к/навук	разам	д/навук	к/навук
КОМПЛЕКС БДУ	**7813**	**279**	**1372**	**713**	**105**	**189**	**1311**	**125**	**330**
у тым ліку: **БЮДЖЭТ:**	**6858**	**274**	**1250**	**625**	**93**	**158**	**1147**	**125**	**314**
апарат кіравання	946	27	76	42	3	5	38		2
прафесарска-выклад. састаў	1893	209	878	208	65	102	101	7	43
навуковыя супрацоўнікі	1072	37	258	157	24	44	556	117	264
ІТР	538		4	94			165		
вучэбна-дапам. персанал	938	1	31	39	1	6	43	1	5
гасп.-абслуг. персанал	1383		3	75		1	243		
рабочыя	88			10			1		
ПА-ЗА БЮДЖЭТАМІ:	**955**	**5**	**122**	**88**	**12**	**31**	**164**		**16**
апарат кіравання	176		19	5		1	33		2
прафесарска-выклад.састаў	405	5	102	60	12	28	39		13
навуковыя супрацоўнікі	78			5			5		
ІТР	97		1	9			61		
вучэбна-дапам. персанал	181			9		2	23		1
гасп.-абслуг. персанал	18						3		

Слайд 2

Звесткі пра сярэднюю заработную плату па комплексе БДУ (2004-2007 гг.)



Графікі росту сярэднямесячнага заробку як у доларах (паводле сярэднегадавога курсу), так і ў беларускіх рублях паказваюць відавочную дынаміку, адкуль вынікае, напрыклад, што заробак ПВС у 2007 годзе вырас у параўнанні з 2004 годам у 1,5–1,6 разоў. Калі ж супаставіць з 2003 годам, то ён павялічыўся болей чым удвая. Нагадаю, што ў 2001 годзе ў доларавым налічэнні было 155 у.а., у 2002-м – 199, у 2003-м – 232. У 2004 годзе, як відаць з табліцы, заробак склаў 314, у 2005-м – 393, у 2006-м – 459, а за восем месяцаў 2007 года – 484 у.а. Са студзеня 2008 года значна ўзрасце стаўка першага тарыфнага разраду (зараз яна складае крыху болей за дзве базавыя велічыні). "Аступенены" прафесарска-выкладчыцкі састаў атрымае істотную прыбаўку да аплаты за сваю працу. Калі раней дактары навук мелі прыбаўку ў 6 базавых велічынь, а кандыдаты навук – у 3, то ў хуткім часе першыя будуць атрымліваць 6 ставак першага тарыфнага разраду і плюс яшчэ 2 стаўкі за званне дацэнта. Такім чынам, з улікам гэтых надбавак і чаканага павышэння заробку можна меркаваць, што прафесары і дактары будуць атрымліваць каля 1,4–1,5 млн руб. (прыкладна 700 долараў ЗША) у месяц.

Слайд 3

Узроставы склад ПВС БДУ па факультэтах на 01.09.2007

Факультэт	да 29 гадоў	больш за 60 гадоў
фізічны	9	34
радыёфізікі і электронікі	4	25
прыкладной матэматыкі і інфарматыкі	11	33
механіка-матэматычны	20	50
хімічны	11	27
біялагічны	7	18
геаграфічны	5	20
філалагічны	33	32
журналістыкі	8	16
гістарычны	10	21
юрыдычны	18	22
філасофіі і сацыяльных навук	14	16
эканамічны	12	11
міжнародных адносін	49	25
гуманітарны	16	7
ваенны	5	0
Агульнаўніверсітэцкія кафедры	31	62
па БДУ	**263**	**419**

Выклікае шкадаванне факт колькаснай разбежкі ўзроставых паказальнікаў паміж моладдзю да 29-ці гадоў і ветэранамі пасля 60-ці гадоў. Прычым гэтая разбежка працягвае павялічвацца, што сведчыць пра старэнне кадраў. Карціна стане паўнейшай, калі правесці аналіз адносна профілю падраздзяленняў. Даныя слайда 3 гавораць аб тым, што менавіта на прыродазнаўчых і матэматычных факультэтах у першую чаргу павінны звярнуць увагу на падрыхтоўку і абнаўленне кадраў. Канешне, у многім гэтыя падраздзяленні сутыкаюцца з аб'ектыўнымі складанасцямі – студэнты адпаведных спецыяльнасцяў прасцей знаходзяць сабе высокааплатную працу на баку і ў іх няма моцнага жадання застацца ва універсітэце, дзе заробкі меншыя. Але праблему трэба рашаць. Гэтаму садзейнічае ўжо прынятае рашэнне Прэзідэнта краіны аб аплаце працы дактароў і кандыдатаў навук.

Слайд 4. **Звесткі аб асноўных работніках ПВС БДУ, якія маюць вучоныя ступені і званні, у дынаміцы з 2001 г.**



Слайд 5

Абарона дысертацый супрацоўнікамі БДУ (2001-2006 гг.)

Калі паглядзець на міжуніверсітэцкую статыстыку па рэспубліцы, то выяўляецца, што доля нашага штатнага ПВС ад колькасці выкладчыкаў вышэйшай школы складае 9,5 %. У нас дактары навук складаюць 16 % – гэта ўтрая вышэй за сярэдні паказальнік па краіне. Адначасова доля кандыдатаў навук у цэлым па ВНУ складае 38 %, тады як у нашым ПВС – 45 %, г.зн. не намнога вышэй за сярэднестатыстычны паказальнік. Тут мы паступова губляем пазіцыі лідара. Тлумачэнне такога становішча звязана таксама з недахопам маладых навуковых кадраў для прыродазнаўчых і матэматычных факультэтаў. Гэта адлюстроўваецца і на абароне дысертацый. На першы погляд сітуацыя здаецца стабільнай (хоць колькасць за апошнія два гады зніжаецца), але зноў-такі за кошт гуманітарных навук. Можна спадзявацца, што будучае павелічэнне заробку станоўча паўздзейнічае на "прыродазнаўчую" і на "матэматычную" моладзь, бо калі кандыдату навук раней дабаўлялася за вучоную ступень менш за 100 тыс. руб., то цяпер – прыкладна 300 тыс. руб., а калі стаць дацэнтам – яшчэ плюс да таго 150 тыс. Гэта добры стымул для маладых спецыялістаў, каб яны абараняліся і надалей працавалі ва універсітэце.

Слайд 6. **Звесткі пра размеркаванне выпускнікоў БДУ дзённай формы навучання, якія вучыліся за кошт бюджэтных сродкаў (2002-2007 гг.)**



Пры характарыстыцы размеркавання выпускнікоў трэба найперш узгадаць нядаўна прыняты Закон аб вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Паводле яго, выпускнікі, якія вучацца за кошт бюджэтных сродкаў, абавязаны адпрацаваць два гады па размеркаванні. Раней гэта прадугледжвалася ў пастановах Савета Міністраў, цяпер набыло форму закона. Асноўным момантам адпаведнага заканадаўчага акта стала, канешне, афіцыйнае зацвярджэнне дзвюх ступеняў вышэйшай адукацыі, як гэта ўласціва агульнаеўрапейскай адукацыйнай прасторы. Першая ступень – дыпламаваны спецыяліст, яго тэрмін навучання 4–5 гадоў, другая – 1–2-гадовая магістратура. Фактычна ўладкаванне нашай сістэмы вышэйшай адукацыі набліжана да французскай мадэлі. Там, дарэчы, для абазначэння першай ступені гэтак жа не выкарыстоўваецца тэрмін "бакалаўр". Прэрагатывай магістратуры стала фарміраванне ведаў і навыкаў навукова-педагагічнай і навукова-даследчай работы з выдачай дыплома магістра, які дазваляе паступаць у аспірантуру ці працаўладкоўвацца. У Законе ўстанаўленне аб'ёму вучэбна-выхаваўчай і навукова-метадычнай дзейнасці ПВС аднесена да кампетэнцыі ВНУ. Пасады ПВС навуковых работнікаў замяшчаюцца па конкурсе, пасля праходжання якога заключаецца працоўная дамова ў адпаведнасці з заканадаўствам, г.зн. праходжанне па конкурсе дае толькі права на заключэнне кантракту. А ўжо тады, пасля яго падпісання, можна прыступаць да працы.

Адзначу, што неабходнасць у падрабязным азнаямленні з Законам аб вышэйшай адукацыі стаіць першым пунктам у рашэнні Вучонага савета.

Слайд 7. **Звесткі пра кантынгент студэнтаў БДУ**

Навучальны год	бюджэт	платнае	усяго
1998-1999	11467	4965	**16432**
1999-2000	11471	4630	**16101**
2000-2001	11480	4580	**16060**
2001-2002	11626	4969	**16595**
2002-2003	11855	5464	**17319**
2003-2004	11977	5770	**17747**
2004-2005	12067	7551	**19618**
2005-2006	12106	9421	**21527**
2007-2008	11727	12818	24545



Слайд 8. **Звесткі пра кантынгент студэнтаў па курсах на 01.09.2007**

курс	дзённае	завочнае	усяго
1	4271	1562	**5833**
2	3695	1424	**5119**
3	3693	1210	**4903**
4	3467	1015	**4482**
5	2888	817	**3705**
6		503	**503**



З улікам замежных грамадзян мы сёлета ажыццявілі самы вялікі прыём. Да нас паступіла болей чым 6 тыс. чалавек, і зараз у БДУ разам з замежнікамі налічваецца больш за 25 тыс. студэнтаў. Гэта добрая дынаміка. Беларускі дзяржаўны універсітэт павінен быць элітнай, але не элітарнай ВНУ, куды проста нельга патрапіць вучыцца. Элітная ВНУ дае высокі ўзровень адукацыйных паслуг шырокім слаям насельніцтва. І паколькі ў нас дастатковая матэрыяльна-тэхнічная база, то колькасць студэнтаў можна яшчэ павялічыць. У 2008 годзе плануецца дабавіць 2 тыс. і выйсці на аптымальны ўзровень 27–28 тыс. Трэба, аднак, вялікую ўвагу надаць удасканаленню арганізацыі вучэбнага працэсу, пошуку новых інавацыйных шляхоў развіцця. Толькі пры такой умове можна будзе не хваляваць за якасць навучання. Адна справа, калі студэнтаў 12 тыс., і зусім іншая, калі іх удвая больш. Таму праграма развіцця БДУ, дзе значнае месца нададзена развіццю самастойнай працы студэнтаў, з'яўляецца як ніколі надзённай.

Акрамя таго, трэба мець на ўвазе, што мы павялічваем кантынгент студэнтаў за кошт платнага навучання, у той час як набор на бюджэтную форму застаецца прыкладна адзін і той жа. Пры тым ў нас высокі ўзровень "платнікаў". Іх сярэдні бал, напрыклад, часцяком перавышае сярэдні бал тых, хто паступіў на бюджэтную форму навучання ў іншыя ВНУ.

Некалькі слоў трэба сказаць пра завочную форму навучання. Неабходна імкнуцца да больш аб'ектыўнай ацэнкі вучэбнай работы завочнікаў. Адным з метадаў можа быць пераход ад напісання рэфератаў да тэставых іспытаў з дапамогай кампутарных тэхналогій, якія дазваляюць ахапіць усе навучальныя аспекты. Яны не адмяняюць іспыты і залікі, але дазваляюць зрабіць кантроль за якасцю падрыхтоўкі студэнтаў-завочнікаў больш строгім. Гэтую ж сістэму з цягам часу можна будзе перанесці і на "дзённікаў".

Слайд 9. **Сярэдняя нагрузка выкладчыкаў БДУ**



У гаворцы пра сярэднюю нагрузку выкладчыкаў трэба мець на ўвазе, што аўдыторная нагрузка складае ў БДУ ў сярэднім толькі 47 % ад агульнай. І яна ў 1,5–2 разы меншая, чым у іншых ВНУ, г.зн. пра перагрузку выкладчыкаў пакуль гаварыць не прыходзіцца. Іншая справа, калі аўдыторная нагрузка значна вышэйшая на гуманітарных спецыяльнасцях, асабліва на філалагічным факультэце і моўных кафедрах. У адукацыйнай практыцы суаднесенасць колькасці студэнтаў дзённай бюджэтнай формы навучання і колькасці прафесарска-выкладчыцкага саставу ў ВНУ не павінна перавышаць 10 : 1, у нас жа сёння ў цэлым на аднаго выкладчыка прыходзіцца 6,5 студэнтаў.

УНІВЕРСІТЭТ

АФІЦЫЙНА

І ЗАДАЧЫ НА 2007/2008 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

Слайд 10

Расходы БДУ на рэалізацыю праекта па пабудове вучэбнага корпуса на Прывакзальнай плошчы (без уліку выплат па IV траншы)

	2001	2002	2003	2004	2005	2006	2007	2008	2009	2010	2011
I транш											
асноўная частка 50%	18,5	20,8	240,5	694,7	413,5	393,3	372,3	177,4			
перадаплата 15%	4,0	199,7	322,2								
У ВЫНІКУ	22,5	220,5	562,7	694,7	413,5	393,3	372,3	177,4			
II транш											
асноўная частка 50%				0,4	5,0	5,0	5,0	5,0			
перадаплата 15%				208,6	194,0	176,8					
У ВЫНІКУ				209,0	199,0	181,8	5,0	5,0			
III транш											
асноўная частка 50%						92,8	356,2	346,9	334,2	323,2	312,4
перадаплата 15%					112,2	143,5	132,5	121,5	110,5	51,2	
У ВЫНІКУ					112,2	236,3	488,7	468,4	444,7	374,4	312,4
НДК на будоўлю					344,0	470,0					
Пабудова нулявога паверху за кошт уласных сродкаў					280,0	280,0					
Усяго	22,5	220,5	562,7	903,7	1348,7	1561,2	866,0	650,8	444,7	374,4	312,4

Слайд 11

Сярэдні кошт платнага навучання ў 2001-2006 гг. (дзённая форма)



Слайд 12

Структура даходаў пазабюджэтных сродкаў БДУ за 2001-2006 гг.



Слайд 13

Структура расходаў пазабюджэтных сродкаў БДУ за 2001-2006 гг. па заработнай плаце рабочых і служачых і налічэннях на яе



У слайдзе 10 прыведзены красамоўныя лічбы. Сумы тут спецыяльна ўказаныя ў еўра, паколькі менавіта ў гэтай валюце мы аплачваем будаўніцтва. Калі ў 2001–2003 гг. універсітэт выплаціў крыху больш за 0,8 млн еўра, то ў 2004–2007 гг. – больш чым 4,6 млн еўра, г. зн. 14 млрд руб. Да таго ж курс еўра з цягам часу значна ўзрос.

Многіх, напэўна, здзівяць гэтыя лічбы. Нагадаю, што па ўмовах выплаты крэдыту, дадзенага нямецкім банкам на будоўлю вучэбнага корпуса, 15 % ад усёй сумы плаціць універсітэт, а астатняя частка выплачваецца папалам з урадам (па першым і трэцім траншах Савет Міністраў узяў выплату ўсёй часткі на сябе). Разліковы кошт узвядзення будынка складаў 13,5 млн еўра (у тым ліку страхоўка), але рэальна спатрэбіцца дадаткова яшчэ 30 % ад гэтай сумы для заканчэння будаўніцтва. Увесь крэдыт быў падзелены на чатыры траншы. Летам 2003 года, калі БДУ ўпершыню ажыццявіў вялікую выплату, ён застаўся без грошай. Сродкаў, што зарабляў тады універсітэт, не ставала, таму былі вымушаныя браць крэдыт для выплаты заробку. Асноўны цяжар выплат прыйшоўся на 2004–2007 гг. Да прыведзеных лічбаў трэба дадаць яшчэ 450 тыс. еўра (115 % ад чацвёртага транша), якія будзем выплачваць з наступнага года на працягу 3-х гадоў. Трэба адзначыць, што універсітэт не адолеў бы выплат, калі б не павялічыў даходы з пазабюджэтных сродкаў, у тым ліку і за кошт платных адукацыйных паслуг. Даходы ў 2007 годзе ўзраслі ў параўнанні з 2003 годам амаль удвая. Калі б не гэта, то БДУ ўвогуле не здолеў бы разлічыцца за будаўніцтва. Пры гэтым трэба мець на ўвазе сітуацыю выдаткаў з пазабюджэтных сродкаў. Іх значную долю – болей за 50 % – займае выплата заробку і налічэнні на яго. Разам з тым, кошт платнага навучання вырас толькі на 29 %, а калі паглядзець па фактычнай аплаце, г. зн. улічыць усе скідкі, якія ёсць ва універсітэце, то ён павялічыўся, у параўнанні з тым жа 2003 годам, усяго на 25 %. Так выглядае рэальная сітуацыя. Таму адукацыйныя паслугі, што падпадаюць у нас пад катэгорыю платных, насамрэч з'яўляюцца такімі часткова. Рэальны іх кошт удвая вышэйшы.

Выхаваўчая работа

У нас ёсць пэўныя дасягненні. У 2007 годзе інтэрнат № 1 заняў першае месца ў конкурсе па добраўпарадкаванні сярод студэнцкіх інтэрнатаў Мінска. Арганізацыя вучэбна-выхаваўчай і ідэалагічнай работы была адзначана другім месцам сярод сталічных ВНУ. Актыўна пачаў працаваць Музей гісторыі БДУ, але стаіць пытанне яго эфектыўнага выкарыстання. Для студэнтаў І курса ўведзены прадмет "Універсітэтазнаўства". Адзначана 5-годдзе дзейнасці БРСМ БДУ. Больш дзейсна працуюць грамадскія арганізацыі, што асобна адзначаю, паколькі мы робім стаўку на студэнцкае самакіраванне, на развіццё грамадскай актыўнасці моладзі ў рамках універсітэта. Значнай падзеяй стала правядзенне на базе БДУ ў студзені–лютым 2007 года Другога з'езда Садружнасці студэнцкіх і маладзёжных арганізацый ВНУ краін СНД, дзе ўдзельнічалі каля 100 прадстаўнікоў студэнцкіх арганізацый і органаў самакіравання з Беларусі, Расіі, Украіны, Арменіі, Азербайджана і Казахстана. Для студэнтаў універсітэта штогод ладзяцца конкурсы "Студэнт года", "Студэнцкі лідар года", "Найлепшы выпускнік БДУ". Па ініцыятыве Студгарадка БДУ ўвесну 2007 года адбыўся Першы адкрыты фестываль маладзёжных відэароліка ў "Кінагрань". У маі Беларускі дзяржаўны універсітэт правёў шырокую патрыятычную і асветніцкую акцыю ў Вязынцы, прымеркаваную да 125-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа. З вялікім поспехам прайшоў чарговы "Тэатральны куфар". Удвая паменшыліся колькасць і віды правапарушэнняў студэнтамі Правілаў унутранага распарадку ў інтэрнатах БДУ. Як відаць, наша выхаваўчая работа ўжо выклікае аптымізм.

Вучэбны корпус на Прывакзальнай плошчы (праект 2008 г.)

МАНІТОРЫНГ

Слайд 14

Як бы Вы вызначылі ўзровень навыкаў самастойнай работы студэнтаў?

студэнты		Варыянты адказаў	выкладчыкі	
2005	2007		2005	2007
7.6%	7.7%	Высокі		1.5%
28.7%	34.6%	Вышэйшы за сярэдні	13.4%	10.8%
49.8%	46.7%	Сярэдні	56.0%	52.1%
7.0%	5.0%	Ніжэйшы за сярэдні	21.8%	28.2%
1.2%	1.9%	Нізкі	6.9%	6.6%
5.7%	4.2%	Цяжка адказаць	1.9%	0.8%

Слайд 15

Як вы лічыце, ці ўласцівыя навучальнаму працэсу на Вашым факультэце гнуткасць, мабільнасць у выбары метадаў выкладання і саміх выкладчыкаў, у змястоўным абнаўленні дысцыплін, вучэбных планаў і адукацыйных тэхналогій?

студэнты		Варыянты адказаў	выкладчыкі	
2005	2007		2005	2007
12.9%	15.9%	Так	42.1%	37.1%
46.5%	44.2%	Хутчэй, што так	48.1%	48.6%
21.9%	23.6%	Хутчэй, што не	6.9%	8.1%
7.8%	7.7%	Не		1.9%
10.9%	8.6%	Цяжка адказаць	2.8%	4.2%

Слайд 16

Якое з наступных выказванняў адлюстроўвае Вашую думку пра якасць навучання?



Са слайда 14 відаць, што большасць рэспандэнтаў, як сярод студэнтаў, так і выкладчыкаў лічаць узровень навыкаў самастойнай работы студэнтаў сярэднім. У высокіх адзнаках выкладчыкі больш стрыманыя, у адрозненне ад студэнтаў. І трэба прызнаць аб'ектыўнасць старшых – яны ведаюць, з кім маюць справу. Сярод моладзі прысутнічае завышаная ацэнка сябе, тады як выкладчыкі сыходзяць з рэальнай сітуацыі.

У наступным слайдзе – розных адценняў станоўчага адказу прытрымліваецца большасць. Але студэнты больш скептычна адносяцца да таго, што адбываецца на факультэце. Мяркую, што заніжэнне ацэнкі з боку студэнтаў і завышэнне з боку выкладчыкаў носіць суб'ектыўны характар. Тыя ж студэнты пры пераходзе на наступны курс могуць недастаткова арыентавацца ў сітуацыі і не ведаць пра змены, якія ўжо адбыліся на пэўнай стадыі навучання. З другога боку гэта сігнал для выкладчыкаў аб неабходнасці даводзіць такую інфармацыю да моладзі.

Цікава выглядае апошні слайд, дзе падаецца апытанне студэнтаў II курса ў 2005 годзе і гэтых жа студэнтаў два гады апасля. Як яны думаюць зараз? 90 % прытрымліваецца пазітыўнай адзнакі, г. зн. лічаць, што ў асноўным усё добра. Але ў аспектах назіраецца размаітасць меркаванняў прыкладна ў роўных прапорцыях. Па розных факультэтах, дарэчы, яны розныя. Нельга не звярнуць увагу на тое, як змянілася настраёвасць студэнтаў. Адначасова трэба ўлічыць і аб'ектыўныя прычыны, паколькі сталенне чалавека і яго "разумненне" заканамерна вядуць да ўзрастання ступені крытычнасці.

Акрамя таго, студэнты адзначаюць, што ім не хапае практычных навыкаў па спецыяльнасці. Частка з іх наракае на недахоп кампутарнай граматнасці, праўда, колькасць гэткіх паменшылася, што, натуральна, звязана са змяненнем характару навучальнага працэсу, дзе ўсё большае месца займаюць інфармацыйныя тэхналогіі. Падобныя пажаданні тычацца і замежных моў. Да гэтага пытання мы хутка вернемся на пасяджэнні Вучонага савета, хоць тут многае залежыць ад саміх студэнтаў, якія павінны пастаянна і мэтанакіравана працаваць над сабой. Аднаго жадання, зразумела, недастаткова. Універсітэт са свайго боку павінен стварыць добрыя ўмовы для вывучэння замежных моў, але неабавязкова ў рамках вучэбнай праграмы. Колькаснае павелічэнне гадзін на вывучэнне замежных моў не прывядзе аўтаматычна да раптоўнага паляпшэння адпаведных ведаў. Таму была прапанаваная ідэя платных факультатываў, якая яшчэ развіваецца і пакуль не мае адпрацаванай сістэмы.

Сёння ўжо няма праблемы кампутарнага аснашчэння, але мы павінны ўсяляк заахвочваць студэнтаў да здабыцця ведаў. Калі ў вучэбным працэсе рэальна дзейнічаюць інфармацыйныя тэхналогіі, то студэнты будуць імкнуцца авалодаць спецыяльнымі навыкамі. Гэта, можна сказаць, пабуджальны матыў. Акрамя яго, павінен быць прымусовы, пад якім разумеецца стварэнне такой арганізацыі вучобы, калі студэнты павінны будуць вучыцца пастаянна, а не ад сесіі да сесіі.

Пытанні практыкі і практычнай падрыхтоўкі па спецыяльнасці будуць грунтоўна абмяркоўвацца на факультэтах, і, апрача ўсяго, стануць тэмай пасяджэння Вучонага савета ў другой палове навучальнага года. Крытыка студэнтаў за недастатковую практычную падрыхтоўку справядлівая. Тут ёсць праблема. Люблю выраз са спартыўнай тэрміналогіі: парадак б'е клас, г. зн. каманда можа быць і без зорак, але добра арганізаванай і таму здольнай займаць самыя высокія месцы. Адносна нашых рэалій гэта азначае стварэнне дакладнай сістэмы (над чым і працуем), пры якой можна дабіцца добрай практычнай падрыхтоўкі для ўсіх без выключэння студэнтаў.

РАШЭННЕ ВУЧОНАГА САВЕТА

Пасля заслухоўвання і абмеркавання даклада рэктара прафесара Васіля Стражава "Вынікі работы Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў 2006/2007 навучальным годзе і задачы на 2007/2008 навучальны год" Вучоны савет адзначыў, што калектыў універсітэта ў мінулым годзе працягваў работу па рэалізацыі мерапрыемстваў Праграм развіцця універсітэта (2005–2011 гг.) і Плана перспектыўнага развіцця на 2006–2010 гг.

У комплексе БДУ згодна са становішчам на верасень 2007 г. працуе 8526 чалавек, з якіх 7813 – на пастаяннай аснове. Разам з сумяшчальнікамі з іншых арганізацый ва універсітэце працуе 384 дактары навук і 1561 кандыдат навук.

Усяго ў комплексе БДУ ў 2007/2008 навучальным годзе налічваецца 24 545 студэнтаў, што перавышае аналагічны паказальнік папярэдняга навучальнага года на 2205 чалавек. На дзённай форме – 18 014 студэнтаў, з іх 8619 (47,8 %) – на платнай аснове.

У аспірантуры навучаецца 664 аспіранты (з іх 97 – па мэтавым накіраванні), у дактарантуры – 21 дактарант.

Сярэдні конкурс сярод абітурыентаў універсітэта ў 2007 г. на дзённую бюджэтную форму навучання склаў 3,21. План прыёму на ўсе спецыяльнасці на дзённую бюджэтную форму выкананы. На дзённую платную форму залічана 2410 чалавек, што перавысіла гэты ж леташні паказальнік на 22 %. На завочную бюджэтную форму навучання план прыёму не выкананы на некаторыя спецыяльнасці геаграфічнага, гістарычнага, механіка-матэматычнага, філалагічнага факультэтаў і факультэта журналістыкі. На завочную платную форму навучання было залічана 1275 чалавек, што на 62 % перавышае ўзровень мінулага года. На 89,6 % болей у параўнанні з 2006 годам залічана замежных грамадзян – 201 чалавек.

У 2006 г. супрацоўнікі універсітэта абаранілі 66 кандыдацкіх і 3 доктарскія дысертацыі, апублікавана 114 манаграфій, 511 вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў, 49 зборнікаў навуковых прац, 4318 навуковых артыкулаў, з якіх 986 – у замежных выданнях.

Бюджэтныя асігнаванні ўсіх сфер універсітэцкай дзейнасці ў 2006 г. склалі 110,4 млрд руб., што на 12,9 % болей за 2005 год. У 2007 г. плануецца павелічэнне грашовых выдаткаў на 45 %.

Агульны аб'ём фінансавання навуковай і навукова-інавацыйнай сферы ў 2006 г. склаў 30,3 млрд руб., у 2007 г. на гэтыя ж мэты запланавана 33,8 млрд руб.

Працягвалася ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы БДУ. Сёння універсітэт без уліку юрыдычных асоб мае 2843 персанальныя кампутары, у 2006 г. гэты паказальнік склаў 2585 адзінак. Вялікі аб'ём работ выкананы на будаўніцтве двух вучэбных карпусоў, адзін з якіх будзе ўведзены ў эксплуатацыю ў лютым 2008 г. (вул. Кальварыйская).

Сярэдняя заработная плата работнікаў БДУ за 6 месяцаў бягучага года склала 774 тыс. руб., прафесарска-выкладчыцкага саставу – 1060 тыс. руб.

У 2006/2007 навучальным годзе ў вучэбна-выхаваўчым працэсе універсітэта ўкараняліся сучасныя формы ідэалагічнай і выхаваўчай работы: дні беларускай гісторыі, дні права, дні псіхалогіі, конкурсы "Студэнт года БДУ", "Найлепшы выпускнік БДУ", "Студэнцкі лідар года", адкрыты гарадскі маладзёжны фестываль відэароліка ў "Кінагрань".

На працягу навучальнага года былі створаныя неабходныя ўмовы па азнаямленні работнікаў і студэнтаў з гісторыяй і традыцыямі універсітэта. Музей гісторыі БДУ стаў неад'емным кампанентам ідэалагічнай і выхаваўчай работы ва універсітэце.

З мэтай навукова-метадычнага забеспячэння ідэалагічнай і выхаваўчай работы ў БДУ, інфармавання студэнтаў і работнікаў універсітэта пра дзейнасць дзяржаўных органаў, эканамічнага, культурнага і міжнароднага жыцця краіны для намеснікаў дэканаў і студэнцкага актыву БДУ арганізаваны пастаянны семінар па актуальных пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь.

У той жа час Вучоны савет адзначае, што не ўсе кафедры ў патрэбнай меры пераходзяць на сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі ў вучэбным працэсе, у тым ліку на тэхналогіі дыстанцыйнага навучання. Як і раней, перагружанасць вучэбных планаў аўдыторнымі заняткамі стрымлівае ўкараненне актыўных форм самастойнай работы студэнтаў. Чакае паляпшэння інфармацыйная работа, накіраваная на максімальнае працаўладкаванне выпускнікоў па атрыманай спецыяльнасці, практычна адсутнічаюць доўгатэрміновыя дамовы з прадпрыемствамі і арганізацыямі аб сумеснай дзейнасці, у тым ліку аб падрыхтоўцы кадраў для іх.

Значна знізіліся паказальнікі па абароне доктарскіх дысертацый супрацоўнікамі універсітэта.

Ва універсітэце да канца не выпрацаваліся дакладныя крытэрыі ацэнкі якасці работы калектываў кафедраў і факультэтаў, што спыняе ўкараненне элементаў спаборніцтва, аб'ектыўнае маральнае і матэрыяльнае стымуляванне лепшых калектываў і іх кіраўнікоў.

Вучоны савет вырашае:

1. Кіраўнікам структурных падраздзяленняў універсітэта арганізаваць вывучэнне Закона аб вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у калектывах і студэнцкіх групах (адказныя – кіраўнікі структурных падраздзяленняў).

2. Упраўленню перспектыўнага развіцця і аналітычнай работы:

- да 1 лістапада 2007 года распрацаваць для зацвярджэння Вучоным саветам Палажэнне аб конкурсе сярод выкладчыкаў, калектываў кафедраў і факультэтаў па выніках працы за навучальны год;

- сумесна з Галоўным упраўленнем вучэбнай і навукова-метадычнай работы да гэта ж тэрміну перагледзець змест пашпартоў кафедраў, тэрмін дзеяння якіх скончыўся ў 2006/2007 навучальным годзе (адказныя – начальнік ГУУНМР, начальнік УПРАР).

3. Пачынаючы з 2007/2008 навучальнага года, сістэматычна заслухоўваць справаздачы кафедраў аб выкананні праграмы "Удасканаленне арганізацыі, забеспячэння і кантролю якасці самастойнай работы студэнтаў (2005–2009)" на пасяджэннях Вучонага і навукова-метадычнага саветаў, рэктарата універсітэта (адказныя – прарэктары па вучэбнай рабоце).

4. Кафедрам, якія выпускаюць, і дэканатам факультэтаў працягнуць працу па забеспячэнні працаўладкавання выпускнікоў універсітэта для працы па спецыяльнасці. Распаўсюдзіць на ўсе факультэты практыку правядзення кірмашоў прафесій, уведзеную ў 2006/2007 навучальным годзе, з запрашэннем заказчыкаў, спецыялістаў і рассылкай кароткіх кваліфікацыйных характарыстык выпускнікоў у зацікаўленыя арганізацыі. Правесці працу па заключэнні доўгатэрміновых пагадненняў аб падрыхтоўцы кадраў для адукацыі, навукова-вытворчай, сацыяльнай і іншых сфераў (адказныя – прарэктары па вучэбнай рабоце, начальнік ГУУНМР, кіраўнікі вучэбных падраздзяленняў).

5. На працягу 2007/2008 навучальнага года ажыццявіць на завочнай форме навучання паступовы пераход ад выканання хатніх пісьмовых заданняў, і кантрольных работ у тым ліку, на кампутарнае тэсціраванне (адказныя – прарэктар па адукацыйных інавацыях і інфармацыйных тэхналогіях, дэканаты, кафедры).

6. Працягнуць увядзенне ў эксплуатацыю медыятэк, у 2007/2008 навучальным годзе стварыць іх на юрыдычным факультэце і факультэце журналістыкі. Скласці план павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў па інфармацыйных тэхналогіях і забяспечыць яго няўхільнае выкананне (адказныя – прарэктары па вучэбнай рабоце, прарэктар па адукацыйных інавацыях і інфармацыйных тэхналогіях, кіраўнікі вучэбных падраздзяленняў).

7. Падрыхтаваць у 2007/2008 навучальным годзе вучэбна-метадычны дапаможнік па курсе "Універсітэтазнаўства", працягнуць падрыхтоўку і выданне кніжак па гісторыі БДУ (адказныя – прарэктары па вучэбнай рабоце).

8. Дэканам факультэтаў:

- прааналізаваць і абмеркаваць на Вучоных саветах факультэтаў вынікі сацыялагічнага маніторынгу (апытанне студэнтаў 2005–2007 гг.) і прыняць неабходныя меры для вырашэння выяўленых праблем, у тым ліку пашырэнне ўдзелу органаў студэнцкага самакіравання (студэнцкі савет па якасці адукацыі і інш.) для рашэння задач па ўдасканаленні вучэбна-выхаваўчага працэсу;

- працягнуць практыку арганізацыі экскурсій у Музей гісторыі БДУ для студэнтаў II–V курсаў;

- разгледзець на Вучоных саветах факультэтаў пытанне арганізацыі падрыхтоўкі студэнтаў завочнай формы для атрымання другой вышэйшай адукацыі па скарочаным тэрміне навучання і да 1 лістапада 2007 года ўнесці ў рэктарат прапановы адносна дадзенага пытання;

- з мэтай прыцягнення моладзі на вучобу ў БДУ, у тым ліку замежных грамадзян, распрацаваць на працягу 2007/2008 навучальнага года "Інфармацыйныя пакеты. Каталогі модуляў" на рускай і англійскай мовах паводле ўзораў, падрыхтаваных у рамках праекта TEMPUS, выкананага ў БДУ ў 2005–2007 гг. Распрацаваныя матэрыялы размясціць на сайтах факультэтаў;

- для развіцця адзінай электроннай інфармацыйнай прасторы ідэалагічнай і выхаваўчай работы ў Белдзяржуніверсітэце ў 2007/2008 навучальным годзе арганізаваць на афіцыйных сайтах факультэтаў размяшчэнне:

1) спасылак на рубрыку "НОВОСТИ: В СТРАНЕ И В МИРЕ" (паводле матэрыялаў БелТА і іншых інфармацыйных крыніц), матэрыялаў Адзінага дня інфармавання, размешчаных на ўнутраным інтэрнэт-сайце БДУ; адукацыйныя і інфармацыйныя рэсурсы органаў дзяржаўнага кіравання Рэспублікі Беларусь;

2) спасылак на рубрыку "ЧАСТО ЗАДАВАЕМЫЕ ВОПРОСЫ" (ОБРАТНАЯ СВЯЗЬ);

3) інфармацыі пра факультэцкія гурткі, секцыі, клубы, аб'яднанні, мерапрыемствы ідэалагічнага і выхаваўчага характару; дзейнасць маладзёжных грамадскіх арганізацый і органаў студэнцкага самакіравання на факультэце, персанальны састаў і кантакты іх лідараў; пра дасягненні лепшых выпускнікоў факультэта.

9. У мэтах падтрымкі і развіцця маладзёжных ініцыятыў вылучыць у 2007/2008 навучальным годзе для правядзення штогадовага конкурсу грантаў "Найлепшы маладзёжны праект" 5 млн. руб.

10. Студэнцкаму гарадку да 15 лістапада 2007 года распрацаваць і падаць на зацвярджэнне Палажэнні аб конкурсах: "Найлепшая арганізацыя ідэалагічнай і выхаваўчай работы ў інтэрнаце БДУ", "Найлепшы педагог-выхавальнік інтэрната БДУ".

11. Кіраўнікам вучэбных і навуковых падраздзяленняў, Савету па навукова-даследчай рабоце студэнтаў і аспірантаў сумесна з Галоўным упраўленнем навукі распрацаваць праграму прыцягнення найбольш таленавітых навучэнцаў у навукова-даследчыя студэнцкія лабараторыі. Паводле прыярытэтных напрамкаў навукова-тэхнічнай дзейнасці стварыць новыя СНДЛ (адказныя – начальнік Галоўнага ўпраўлення навукі, кіраўнікі вучэбных і навуковых падраздзяленняў).

12. У мэтах прасоўвання навукова-тэхнічнай прадукцыі комплексу БДУ на рынак, пашырэння яе экспартных магчымасцяў выканаўцам заданняў Праграмы інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь прыняць актыўны ўдзел у яе ажыццяўленні. Галоўнаму ўпраўленню навукі сумесна з распрацоўшчыкамі правесці ацэнку ступені падрыхтаванасці навукова-тэхнічнай прадукцыі да яе камерцыйнай рэалізацыі (адказны – прарэктар па навуковай рабоце).

13. Стварыць да 1 лістапада 2007 года рабочую камісію па падрыхтоўцы святкавання 90-годдзя з дня заснавання БДУ. Камісіі распрацаваць план святочных мерапрыемстваў і пералік асноўных паказальнікаў, якія павінны быць дасягнуты калектывам універсітэта да 2011 года (адказныя – рэктар, прарэктары).

14. На працягу 2007/2008 навучальнага года абмеркаваць на пасяджэннях Вучонага савета універсітэта пытанні навучання замежным мовам, кампутарнай граматнасці, практычнай падрыхтоўкі па спецыяльнасцях.

САЦЫЯЛАГІЧНАЕ АПЫТАННЕ ПЕРШАКУРСНІКАЎ

1. Чаму Вы паступілі менавіта ў БДУ?

	2005	2006	2007
Гэта прэстыжная ВНУ	44.0%	42.2%	54.4%
Тут высокі ўзровень выкладання	55.6%	53.9%	59.7%
Мне парайі знаёмыя, сябры, сваякі	6.1%	7.3%	9.8%
Тут можна атрымаць цікавую для мяне спецыяльнасць	48.0%	38.3%	53.2%
Дыплом БДУ дае магчымасць зрабіць кар'еру, заняць добрую пасаду	41.2%	32.6%	44.5%
Іншы адказ	4.5%	2.9%	5.7%

2. Як Вы лічыце, навучанне ў БДУ забяспечыць Вам

		2005	2006	2007
неабходны ўзровень тэарэтычнай падрыхтоўкі па спецыяльнасці	Так	69.8%	74.7%	75.9%
	Хутчэй, што так	28.1%	23.3%	22.2%
	Хутчэй, што не	1.6%	1.5%	.6%
	Не	0.3%		0.9%
неабходны ўзровень практычнай падрыхтоўкі па спецыяльнасці	Так	48.6%	54.3%	58.2%
	Хутчэй, што так	41.1%	38.7%	36.1%
	Хутчэй, што не	9.1%	5.7%	4.3%
	Не	1.0%	0.6%	0.8%
высокую агульнакультурную эрудыцыю	Так	45.7%	47.6%	46.8%
	Хутчэй, што так	43.7%	44.5%	45.0%
	Хутчэй, што не	8.5%	5.8%	6.1%
	Не	1.5%	1.0%	1.4%
веданне замежнай мовы на высокім узроўні	Так	21.4%	25.3%	26.6%
	Хутчэй, што так	47.6%	49.8%	52.1%
	Хутчэй, што не	24.7%	20.5%	17.9%
	Не	5.4%	3.8%	2.7%
навыкі працы з кампутарам	Так	33.6%	30.1%	37.7%
	Хутчэй, што так	43.7%	49.3%	46.6%
	Хутчэй, што не	17.1%	15.4%	12.3%
	Не	3.9%	3.9%	2.3%
уменне самастойна папаўняць веды выкарыстоўваць іх на практыцы	Так	50.9%	56.9%	58.8%
	Хутчэй, што так	39.4%	37.1%	36.8%
	Хутчэй, што не	7.1%	4.1%	3.7%
	Не	2.2%	1.2%	.5%
неабходныя камунікатыўныя і кіраўніцкія навыкі	Так	34.3%	40.6%	42.4%
	Хутчэй, што так	47.3%	44.1%	42.8%
	Хутчэй, што не	14.2%	12.8%	11.9%
	Нет	3.4%	1.9%	2.5%
уменне разбірацца ў жыццёвых сітуацыях	Так	21.7%	25.3%	27.4%
	Хутчэй, што так	42.6%	46.0%	45.5%
	Хутчэй, што не	26.4%	20.5%	20.6%
	Не	8.5%	7.4%	6.1%

3. Пры падрыхтоўцы да паступлення Вы

	2005	2006	2007
займаліся на платных курсах (напрыклад, замежная мова, гісторыя, матэматыка і г.д.)	18.4%	21.4%	20.2%
займаліся на падрыхтоўчым аддзяленні	6.9%	7.3%	5.5%
наведвалі рэпетытараў	59.7%	59.2%	58.2%
рыхтаваліся самастойна (спецыяльная літаратура, бясплатныя факультатывы, інтэрнэт)	54.8%	65.8%	68.1%
іншае	2.4%	2.0%	3.9%
спецыяльна не рыхтаваліся, паколькі было дастаткова школьнай падрыхтоўкі	4.9%	3.8%	3.6%

4. Якую форму падрыхтоўкі Вы лічыце самай эфектыўнай?

	2005	2006	2007
Заняткі на платных курсах (напрыклад, замежная мова, гісторыя, матэматыка і г.д.)	2.9%	3.1%	4.1%
Заняткі на падрыхтоўчым аддзяленні	6.3%	7.7%	6.1%
Наведванне рэпетытараў	54.4%	55.3%	52.9%
Самастойная падрыхтоўка (спецыяльная літаратура, бясплатныя факультатывы, інтэрнэт)	29.7%	29.3%	31.3%
Іншае	0.9%	1.2%	1.1%
Дастаткова школьнай падрыхтоўкі	1.4%		0.4%
Няма адказу	4.4%	3.5%	4.2%

5. Як Вы лічыце, паступленне ва універсітэт павінна праходзіць у форме

	2005	2006	2007
уступных іспытаў	21.8%	26.3%	30.5%
адзінага тэсціравання	23.8%	29.8%	22.9%
спалучэння ўступных іспытаў і тэсціравання	45.4%	33.5%	35.3%
іншае	1.6%	2.0%	2.0%
цяжка адказаць	7.5%	8.3%	9.3%

6. Што Вы адчуваеце, стаўшы студэнтам БДУ?

	2005	2006	2007
Адчуваю гонар	52.0%	54.6%	50.8%
Адчуваю перавагу	9.9%	5.8%	5.6%
Адчуваю сябе звычайным студэнтам	38.5%	31.3%	34.8%
Іншае	6.1%	7.9%	7.9%
Няма адказу	0.5%	0.4%	0.9%

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

ВЫНІКІ ПРЫЁМНАЙ КАМПАНІІ–2007 У БДУ

Закончылася гарачая пара ўступных іспытаў. Студэнтамі Беларускага дзяржаўнага універсітэта стала 5928 абітурыентаў, у тым ліку на дзённую бюджэтную форму навучання паступіла 1810 чалавек, дзённую платную – 2445, завочную бюджэтную – 344, завочную платную – 1069, замежных грамадзян – 201.

На спецыяльнасці ваеннага факультэта залічана 59 абітурыентаў. Сярод залічаных замежных грамадзян – прадстаўнікоў 16-ці краін – як і ў папярэднія гады высокі працэнт складаюць грамадзяне Кітая – 68 %.

Пра маштабы прыёмнай кампаніі можна меркаваць па наступных лічбах. Ва універсітэт на бюджэтную форму навучання было пададзена 5810 заяў. Да правядзення ўсёй уступнай кампаніі было прыцягнута 160 выкладчыкаў БДУ ў складзе 11-ці экзаменацыйных камісій. У 2007 г. набор у БДУ праводзілі 16 факультэтаў і 3 інстытуты па больш чым 90 спецыяльнасцях, напрамках і спецыялізацыях. У прыёме дакументаў былі задзейнічаныя больш за 140 супрацоўнікаў тэхнічнага сакратарыяту, 24 аператары лічбавага фатаграфавання, 36 чалавек групы па эксплуатацыі кампутарнай і арганізацыйнай тэхнікі. Для павелічэння эфектыўнасці прыёму дакументаў была створаная грамадская прыёмная камісія са студэнтаў універсітэта, якія прайшлі спецыяльную падрыхтоўку. Каля 120-ці студэнтаў дапамагалі абітурыентам запаўняць неабходныя дакументы.

Табліца 1

	2001	2002	2003	2004	2005	2006	2007
Колькасць пададзеных заяў	6378	6428	5656	8413	7909	4930	5810
Залічана	1872	1874	1899	2000	2006	1901	1810
Конкурс	3,41	3,43	2,98	4,21	3,94	2,59	3,21

У 2006 г. у шэрагу вышэйшых навучальных устаноў (у прыватнасці, БДУ, БДПУ імя М. Танка, Гродненскі дзяржаўны універсітэт і інш.) быў адзначаны недабор студэнтаў на спецыяльнасці прыродазнаўчага профілю. Гэта было выклікана, з аднаго боку, зніжэннем цікавасці школьнікаў да прыродазнаўчых навук увогуле (агульнасусветная тэндэнцыя апошніх дзесяцігоддзяў) і адпаведным скарачэннем жадаючых навучацца па спецыяльнасцях фізіка-матэматычнага і хімічнага профіляў. З другога боку, такое становішча тлумачыцца яшчэ і тым, што ў названых ВНУ іспыт на прыродазнаўчых спецыяльнасцях праводзіўся прадметнымі камісіямі ВНУ, і частка абітурыентаў адмовілася ўдзельнічаць у ім з прычыны наяўнасці сертыфікатаў цэнтралізаванага тэсціравання з дастаткова высокімі баламі. Усяго ж у ВНУ рэспублікі ў 2006 годзе толькі па 15 % спецыяльнасцяў, у тым ліку творчых, праходзілі профільныя ўнутрыуніверсітэцкія іспыты. Большасць жа ВНУ прымалі толькі сертыфікаты цэнтралізаванага тэсціравання.

У 2007 годзе пераважная колькасць ВНУ адмовілася ад правядзення профільнага іспыту і залічэнне адбывалася толькі па выніках цэнтралізаванага тэсціравання. Сярод дзяржаўных ВНУ толькі ў БДУ праводзіўся профільны іспыт. Тры сертыфікаты цэнтралізаванага тэсціравання прымаліся на эканамічным, юрыдычным, шэрагу спецыяльнасцяў гуманітарнага факультэта, факультэце філасофіі і сацыяльных навук, факультэце міжнародных адносін, Дзяржаўным інстытуце бізнэсу і мэнэджмэнту тэхналогій, Дзяржаўным інстытуце кіравання і сацыяльных тэхналогій. Профільны іспыт праводзіўся на спецыяльнасцях прыродазнаўчых факультэтаў, філалагічнага і гістарычнага факультэтаў.

Улічыўшы ўрокі мінулай прыёмнай кампаніі, у 2006/2007 навучальным годзе ў БДУ была наладжана шырокамаштабная прафарыентацыйная работа. Актывізавалася дзейнасць "школ для юнацтва" на хімічным, геаграфічным, філалагічным факультэтах, факультэце журналістыкі, ФПМІ. Фізічны і радыёфізічны факультэты стварылі вочна-завочныя школы абітурыентаў. Вялікай папулярнасцю карысталася інтэрактыўная старонка "Абітурыент–2007" на універсітэцкім сайце, куды з рознымі пытаннямі звярталіся абітурыенты і іх бацькі і атрымлівалі адказы ў рэжыме on-line. Упершыню БДУ браў удзел у Рэспубліканскай адукацыйнай выставе "Адукацыя і кар'ера". Былі падрыхтаваныя рэкламныя матэрыялы пра ўсе факультэты і інстытуты універсітэта. Факультэты арганізавалі і правялі пробныя экзамены, алімпіяды школьнікаў "Абітурыент БДУ–2007". Усе гэтыя і іншыя мерапрыемствы прынеслі добрыя вынікі. Конкурс ва універсітэце аказаўся значна вышэйшым у параўнанні з леташнім.

У конкурсе на завочную бюджэтную форму навучання маглі ўдзельнічаць толькі абітурыенты, якія ці працавалі, ці скончылі сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы па адпаведнай спецыяльнасці.

Далёка не ўсе абітурыенты і іх бацькі здолелі цалкам разабрацца з асаблівасцямі правілаў прыёму. Натуральна, што гэта спарадзіла некаторыя хваляванні і нервознасць. Акрамя таго, магчымасць пастаянна сачыць за працэсам падачы дакументаў дазволіла абітурыентам чакаць да апошняга дня ў спадзяванні "перакінуць" дакументы з факультэта на факультэт, са спецыяльнасці на спецыяльнасць. Асабліва напружанымі былі дні 29 ліпеня (заканчэнне падачы дакументаў на ўсе формы навучання) і 9 жніўня (заканчэнне прыёму дакументаў на платную форму ад асоб, што не прайшлі па конкурсе на бюджэтную форму навучання).

Абітурыенты маглі кансультавацца ў работнікаў сакратарыяту, якія дапамагалі разабрацца ў складаных сітуацыях; эфектыўна працавала юрыдычная служба прыёмнай кампаніі. На многія пытанні абітурыенты і іх бацькі атрымлівалі адказы падчас дзвюхгадзіннай прэс-канферэнцыі, праведзенай членамі сакратарыяту.

Табліца 2

	План прыёму	Залічана	У тым ліку				
			без іспытаў	па-за конкурсам	па мэтавым прыёме	толькі па сертыфікатах ЦТ	па сертыфікатах ЦТ і профільным іспыце
Усяго	1870	1869	133	122	12	492	1245
у %		99	7,1	6,5	0,6	26,3	66,6

Прыёмная кампанія ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, як заўсёды, знаходзілася пад пільнай увагай з боку дзяржавы: Камісію па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў у БДУ ўзначальваў намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь А. Абрамовіч. Да працы прадметных камісій прыцягваліся члены рэзервовых экзаменацыйных камісій, у прыватнасці, праверку пісьмовых работ абітурыентаў, якія паступалі ў Юрыдычны каледж БДУ на аснове базавай адукацыі, ажыццяўлялі толькі члены рэзервовай камісіі.

Як і ў мінулыя гады, падчас прыёму дакументаў выкарыстоўвалася сістэма электроннай падрыхтоўкі экзаменацыйных аркушаў з нанясеннем лічбавага фатаздымка абітурыента і аўтаматычным унясеннем адзнак сертыфікатаў цэнтралізаванага тэсціравання. Гэта дазволіла паскорыць апрацоўку дакументаў, павысіць ступень абароны і пазбегнуць тэхнічных памылак. Дадзеная тэхналогія з'яўляецца адным з элементаў сістэмы электроннай ідэнтыфікацыі выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў, якая ўкараняецца зараз ва універсітэце. Тым самым быў зроблены яшчэ адзін крок наперад да беспапяровай тэхналогіі ў арганізацыі дзейнасці вышэйшых навучальных устаноў, якая сёння актыўна замацоўваецца ў вядучых ВНУ свету.

Прыёмная камісія аператыўна змяшчала інфармацыю па ўсіх спецыяльнасцях з указаннем сумы набраных балаў не толькі на інфармацыйных стэндах, але і на спецыяльнай старонцы сайта БДУ, а таксама на вялікім экране ў фае галоўнага корпуса.

Беларускі дзяржаўны універсітэт Указам Прэзідэнта быў вызначаны кардынуючым цэнтрам для правядзення цэнтралізаванага тэсціравання па Мінску, дзе размешчана 32 пункты тэсціравання. На базе універсітэта цэнтралізаванае тэсціраванне ажыццяўлялася па 6-ці прадметах у чэрвені і па 14-ці прадметах у рэзервовы дзень 4 ліпеня. Агульная колькасць зарэгістраваных абітурыентаў у БДУ склала 19 687 чалавек (у 2006 г. – 18 391), а ўдзел у цэнтралізаваным тэсціраванні прынялі 18 542 чалавекі (у 2006 г. – 17 354). Для правядзення цэнтралізаванага тэсціравання было прыцягнута болей за 420 выкладчыкаў універсітэта.

На дзённую форму навучання было пададзена 5810 заяў на 1810 планавых месцаў (без ваеннага факультэта), на завочную – 845 заяў на 435 месцаў. Сярэдні конкурс па універсітэце на дзённую форму склаў 3,21 чалавекі на месца, на завочную форму – 1,94. Конкурс на дзённую платную форму навучання склаў 1,62 чалавекі.

У табліцы 1 паказана дынаміка паступленняў на дзённую бюджэтную форму навучання за апошнія 7 гадоў.

Дыяграма 1



Профільны іспыт у БДУ здавалі 3994 абітурыенты, а вытрывалі – 3930 чалавек, што складае 93,4 %. Вынікі ў цэлым неблагія, калі ўлічыць высокі ўзровень патрабаванняў прадметных камісій. Так, самыя высокія балы – 8, 9, 10 – склалі 17 % ад усіх атрыманых адзнак.

Прахадны бал сярод пераважнай большасці спецыяльнасцяў вырас на 15–20 пазіцый. Самы высокі зафіксаваны на спецыяльнасцях факультэта міжнародных адносін: "Сусветная эканоміка" – 363, "Міжнародныя адносіны" – 356, "Міжнароднае права" – 355, "Мэнэджмэнт у сферы міжнароднага турызму" – 355. У цэлым, 86 абітурыентаў, якія паступалі па выніках толькі цэнтралізаванага тэсціравання, атрымалі 360 і больш балаў. Сярод іх 22 абітурыенты на спецыяльнасці "Сусветная эканоміка", 18 – "Мэнэджмэнт у сферы міжнароднага турызму", 8 – "Міжнародныя адносіны", 6 – "Міжнароднае права", па 5 на спецыяльнасці "Фінансы і крэдыт", "Мытная справа" і "Лінгвакраіназнаўства".

Дыяграма 2



Дыяграма 3



На асобныя спецыяльнасці конкурс значна вырас у параўнанні з мінулым годам. Самым высокім не толькі ў БДУ, але і па ўсіх ВНУ краіны быў конкурс на спецыяльнасць "Дызайн" (напрамак – камунікатыўны дызайн) – 14,5 чалавека на месца. Конкурс больш за 5 чалавек на месца здарыўся на наступных спецыяльнасцях: "Псіхалогія" (гуманітарны ф-т) – 13; "Міжнароднае права" – 11; "Міжнародныя адносіны" – 10,2; "Сучасныя замежныя мовы" (кампутарная лінгвістыка) – 9,4; "Сацыялогія" (гуманітарны ф-т) – 9,2; "Бізнэс-адміністраванне" – 8,5; "Правазнаўства" – 5,12; "Геаэкалогія" – 5.

Сярод факультэтаў прыродазнаўчага профілю самы высокі конкурс – больш за 4 чалавекі на месца – быў зафіксаваны на біялагічным факультэце. На іншых факультэтах конкурс выглядаў наступным чынам: геаграфічны факультэт – 2,37; факультэт радыёфізікі і электронікі – 2,1; фізічны факультэт і ФПМІ – 1,7.

Як заўсёды, высокі конкурс склаўся і ў Юрыдычным каледжы БДУ на аснове базавай адукацыі, дзе на 50 месцаў прэтэндавала 537 абітурыентаў. Упершыню за многія гады конкурс на базе сярэдняй адукацыі аказаўся больш за 5 чалавек на месца.

На працягу апошніх трох гадоў вызначылася тэндэнцыя да зніжэння колькасці медалістаў. Гэта тлумачыцца змяненнем парадку ўзнагароджання выпускнікоў школ залатымі і срэбнымі медалямі.

Большасць выпускнікоў Ліцэя БДУ паступіла на факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі – 44 чалавекі (33 % ад усіх абітурыентаў, што закончылі Ліцэй БДУ).

Сярэдні бал атэстата абітурыентаў, залічаных на I курс, склаў 8,71, прычым па шэрагу спецыяльнасцяў гэты паказальнік быў значна вышэйшы. Так, на спецыяльнасцях "Міжнароднае права", "Сусветная эканоміка", "Міжнародныя адносіны", "Мэнэджмэнт", "Фінансы і крэдыт" ён складае 9,2–9,4.

Ад выпускнікоў сельскіх школ паступіла 653 заявы, што крыху болей у параўнанні з мінулым годам (510). Адпаведна і колькасць тых, хто паступіў, аказалася вышэйшай: 232 супраць 218. Гэта склала 12,4 % ад агульнай колькасці на дзённую бюджэтную форму (у 2006 г. – 11,5 %). Колькасная суаднесенасць гарадскіх і сельскіх абітурыентаў, залічаных на дзённую бюджэтную форму, паказана на дыяграме 1. Узровень падрыхтоўкі сельскіх абітурыентаў дастаткова высокі, пра што сведчыць наступны факт: па 38-мі спецыяльнасцях сельскія абітурыенты набралі больш высокі бал, чым гарадскія школьнікі.

Вынікі прыёмнай кампаніі вызначылі яшчэ адну тэндэнцыю: БДУ не з'яўляецца ВНУ толькі для мінчан. Калі ў 2001 г. сярод залічаных было больш за 52 % выпускнікоў мінскіх школ, у 2005 г. іх колькасць склала амаль 39 %, то сёлета – 34,2 %. Павялічылася колькасць абітурыентаў з Магілёўскай і Гродненскай абласцей. Прыём на дзённую бюджэтную і платную формы навучання па рэгіёнах паказаны на дыяграмах 2, 3.

У якасці пажадання прыёмнай камісіі 2008 года хочацца звярнуць увагу на неабходнасць узмацнення прафарыентацыйнай работы сярод школьнікаў, дзе актыўна павінны ўдзельнічаць усе факультэты і інстытуты БДУ. Эфектыўная канкурэнцыя на рынку адукацыйных паслуг патрабуе распрацоўкі сучасных інфармацыйных матэрыялаў для абітурыентаў па ўсіх спецыяльнасцях універсітэта. Неабходна пашырыць практыку ўдзелу БДУ ў днях абітурыента, адукацыйных выставах, якія ладзяцца не толькі ў Мінску, але і ва ўсіх абласных цэнтрах.

У цэлым неабходна адзначыць, што прыёмная кампанія ў БДУ прайшла паспяхова. Загаддзя спланаваная і добра арганізаваная работа дазволіла звесці да мінімуму ўсе праблемы, якія ўзнікалі ў гэты напружаны час. Кожны супрацоўнік універсітэта вельмі добра ўяўляў важнасць і адказнасць работы, што праводзілася прыёмнай камісіяй. Пытанні арганізацыі прыёму ўсе службы БДУ лічылі прыярытэтнымі.

Неабходна выказаць словы падзякі за самаадданую працу супрацоўнікам універсітэта і ўсім, хто прымаў удзел у арганізацыі і правядзенні цэнтралізаванага тэсціравання і ўступных іспытаў. Хочацца верыць, што новыя студэнты БДУ будуць захоўваць і множыць традыцыі універсітэта.

Людміла ХУХЛЫНДЗІНА,
адказны сакратар
прыёмнай камісіі

Табліца 3

Форма навучання	Усяго	З іх							
		Медалісты і дыпломы з адзнакай	%	Пераможцы рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд, лаўрэаты Прэзідэнцкага фонду	%	Выпускнікі ліцэяў і гімназій	%	У тым ліку выпускнікі Ліцэя БДУ
дзённая бюджэтная	1901	287	15	133	7,1	848	45	134

АБ'ЯВЫ

"НАЦЫЯНАЛЬНЫ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ЦЭНТР ПРЫКЛАДНЫХ ПРАБЛЕМ МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ" БДУ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантнай пасады

МАЛОДШАГА НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА навукова-даследчай лабараторыі матэматычных метадаў аховы інфармацыі.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220030, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 4, каб. 702, НІДЦ прыкладных праблем матэматыкі і інфарматыкі; тел. 209-51-04.

ДУА "ІНСТЫТУТ БЕСПЕРАПЫННАЙ АДУКАЦЫІ" БДУ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад

ДАЦЭНТАЎ кафедры культуры і турызму – 2 чалавекі;

ЗАГАДЧЫКА кафедры дауніверсітэцкай падрыхтоўкі, прыродазнаўства.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Кастрычніцкая, 4, каб. 208; тэл. 227-13-48.

"ІНСТЫТУТ ЯДЗЕРНЫХ ПРАБЛЕМ" БДУ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасады

ЗАГАДЧЫКА лабараторыі.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 11, каб. 315, аддзел кадраў; тэл. 226-42-31.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ НАВУКОВА-ВУЧЭБНЫ ЦЭНТР ФІЗІКІ ЧАСЦІЦ І ВЫСОКІХ ЭНЕРГІЙ БДУ (НЦ ФЧВЭ БДУ)

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантнай пасады

НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА лабараторыі электронных метадаў і сродкаў эксперыменту – 1 чалавек.

Тэрмін падачы дакументаў – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220040, г. Мінск, вул. М. Багдановіча, 153, каб. 206, аддзел кадраў, А. Несцяровіч; тэл.: 292-60-34.

НАВУКОВЫ ІНТАРЭС

МАГІСТРАТУРА СКІРОЎВАЕЦЦА НА АСПІРАНТУРУ

Прыём у магістратуру БДУ ў гэтым годзе, а таксама пачатак заняткаў у ёй азнаменаваліся прыняццем першага ў гісторыі краіны Закону "Аб вышэйшай адукацыі", паводле якога тая абвешчана другой ступенню адукацыі пасля дыплома спецыяліста – першай ступені адукацыі.

Згодна з новым заканадаўчым актам, "другая ступень вышэйшай адукацыі (магістратура) забяспечвае фарміраванне ведаў і навыкаў навукова-педагагічнай і навукова-даследчай работы і завяршаецца прысваенням ступені "магістр" і выдачай дыплома магістра, які дае права на навучанне ў аспірантуры (ад'юнктуры) і (або) на працаўладкаванне з улікам раней прысвоенай кваліфікацыі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй і навучання ў магістратуры". Працягласць магістратуры БДУ па ўсіх спецыяльнасцях дзённай формы навучання – адзін год.

Новы план падрыхтоўкі студэнтаў магістратуры прадугледжвае, акрамя дзяржэкзамену ў канцы навучання і напісання магістэрскай дысертацыі, як гэта было раней, абавязковую здачу кандыдацкіх экзаменаў па філасофіі і метадалогіі навукі, замежнай мове, а таксама кандыдацкага заліку па асновах інфармацыйных тэхналогій, якія дагэтуль былі абавязкамі аспірантаў. Такім чынам, у магістранта цяпер узрастае нагрузка і павялічваецца адказнасць за якасць свайго навучання, а аспірант на працягу трох гадоў можа займацца толькі зборам і аналізам навуковага матэрыялу для напісання кандыдацкай дысертацыі і не губляць час на экзамены. Становіцца відавочным, што магістратура ўсё больш арыентуецца на аспірантуру і намагаецца даць веды, якія спатрэбяцца, у першую чаргу, менавіта там.

Нягледзячы на апошнія нововвядзенні і павелічэнне нагрузкі, жадаючых вучыцца ў магістратуры не стала меней. Па словах начальніка вучэбна-метадычнага аддзела Галоўнага ўпраўлення вучэбнай і навукова-метадычнай работы Ірыны Латушка, сёлета сюды набралі 185 чалавек на бюджэтную дзённую форму навучання (у мінулым годзе – 180) і 133 чалавекі на платную дзённую і завочную формы навучання (летась – 70). У 2007 годзе на месца магістранта прэтэндавала ў сярэднім два чалавекі (усяго было пададзена 339 заяў). Аднак назіралася нераўнамернасць: напрыклад, на спецыяльнасці гуманітарнага факультэта прэтэндавалі ўсе тры чалавекі на месца; на філалагічным факультэце, дзе план прыёму – 15 чалавек, была пададзена ажно 41 заяўка. А вось на геаграфічным факультэце зусім адваротная сітуацыя: на 7 месцаў было толькі 3 заявы. На фізічным факультэце падобна: 11 чалавек на 13 месцаў.

Дарэчы, сёлета ўпершыню правілы прыёму ў магістратуру распрацоўвала Міністэрства адукацыі (раней гэта рабіў сам універсітэт). Іх адметнасцю стаў адзін уступны экзамен па спецыяльнасці і адсутнасць экзамену па замежнай мове, у адрозненне ад папярэдніх гадоў. Каб павысіць эфектыўнасць магістратуры, прапанаваныя ёю спецыяльнасці былі максімальна набліжаны да тых, што ёсць у аспірантуры. Напрыклад, дыпламаваны сацыяльны работнік мог падаваць дакументы на спецыяльнасць другой ступені вышэйшай адукацыі "Псіхалогія", што адпавядае навуковай галіне аспірантуры "Псіхалагічныя навукі". Тэолаг – на адпавядаючую спецыяльнасць "Рэлігіязнаўства, філасофская антрапалогія, філасофія культуры". А вось замест былой спецыяльнасці магістратуры "Гісторыя" (напрамак – айчынная і ўсеагульная) з 12-цю спецыялізацыямі на другой ступені вышэйшай адукацыі ўведзены 3 асобныя спецыяльнасці: "Усеагульная гісторыя", "Айчынная гісторыя", а таксама "Гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання", якія адпавядаюць тым, што ў аспірантуры. Другія напрамкі спецыяльнасці "Гісторыя" таксама трансфармаваліся. Такія захады, канешне, павінны атрымаць свой плён, бо раней навучальны працэс у магістратуры не зусім адпавядаў патрабаванням аспірантуры. Магчыма, таму толькі 20 % з тых, каму была прысвоена акадэмічная ступень магістра, пачынаючы з 1996 года, паступілі потым у аспірантуру БДУ. Сёння відавочная цяга магістрантаў да працяг-вання навуковай дзейнасці. І не ў апошнюю чаргу таму, што ў аспірантуры для іх створаны спрыяльныя ўмовы.

Дарэчы, з 1996 года ў магістратуры БДУ прайшло навучанне каля 1000 чалавек. Ці гэта шмат – гаварыць не прыходзіцца, паколькі набор туды універсітэт ажыццяўляе ў асноўным па дзяржаўным заказе. І калі гэта мала – значыць вялікай патрэбы ў магістрах на рынку працы пакуль няма. У многіх выпадках работадаўцаў задавальняе дыплом спецыяліста. І пакуль не будзе распрацавана працоўнае заканадаўства, якое б улічвала наяўнасць у нашай краіне дзвюх ступеняў адукацыі і рэгламентавала, якія пасады можа займаць магістр, гаворка аб прымяненні яго ведаў і навыкаў у практычнай сферы будзе весціся толькі на тэарытычным узроўні.

Ганна ЛАГУН

"Народная газета" – магістратура ў БДУ і МДУ (04.10).

"Звязда" – Міжнародны тэатральны фестываль "Тэатральны куфар" (28.09, 03.10); мемарандум паміж БДУ і Джэцзянскім акіянічным універсітэтам (28.09).

"Минский курьер" – Міжнародны тэатральны фестываль "Тэатральны куфар" (27.09; 03.10); узнагароджанне лепшых студатрадаў БДУ (03.09).

"Вечерний Минск" – Міжнародны тэатральны фестываль "Тэатральны куфар" (27.09, 03.10); пра метэарытныя і зорныя дажджы расказваюць у абсерваторыі БДУ (02.10.).

"Труд" – Размеркаванне студэнтаў ВНУ (27.09).

"Минск-новости" – Міжнародны тэатральны фестываль "Тэатральны куфар" (26.09); новая тэхналогія атрымання пітной вады з забруджаных крыніц (06.10); узнагароды за навуковыя распрацоўкі вучоных БДУ на выставе-кангрэсе ў Санкт-Пецярбургу "Высокія тэхналогіі. Інавацыі. Інвестыцыі" (10.10).

"Настаўніцкая газета" – кіраўнік беларускай каманды на канферэнцыі маладых вучоных у Іспаніі канд. ф.-м. н., дацэнт кафедры тэарэтычнай фізікі БДУ Віталь Жылко каментуе вынікі гэтай канферэнцыі (25.09); Міжнародны тэатральны фестываль "Тэатральны куфар" (04.10).

tut.by – Міжнародны тэатральны фестываль "Тэатральны куфар" (24.09, 01.10, 07.10); пра метэарытныя і зорныя дажджы расказваюць у абсерваторыі БДУ (01.10.).

"Рэспубліка" – навучанне замежных студэнтаў у БДУ (22.09); інтэрв'ю са студэнтам IV курса механіка-матэматычнага факультэта БДУ Сяргеем Яфіменка (25.09); узнагароджанне лепшых студатрадаў БДУ (03.10).

"Обозреватель" – даследаванні па азонавым дзіркам, якія праводзіць ННДЦ МА БДУ (21.09).

"Знамя юности" – узнагароды газеты БДУ "Універсітэт" на VI Адкрытым фестывалі дзіцячых і маладзёжных СМІ Украіны "Націскай на RECord" (21.09); Міжнародны тэатральны фестываль "Тэатральны куфар"; фестываль студэнцкай творчасці БДУ; VIII Міжнародная канферэнцыя "Кампутарны аналіз дадзеных і мадэляванне" (28.09); пра метэарытныя і зорныя дажджы расказваюць у абсерваторыі БДУ (05.10); VII Міжнародная канферэнцыя "Узаемадзеянне выпраменьванняў з цвёрдым целам" (05.10).

"Во славу Родины" – агляд-конкурс ваеннага факультэта БДУ (20.10); выстава студэнта IV курса БДУ Аляксея Міхайлава "Гармонія кантрастаў"; заняткі па стральбе на ваенным факультэце БДУ з дапамогай трэнажора "Сокол-М1С" (21.09); нататкі лэйтэнанта Аляксандра Гулева пра вучобу на ваенным факультэце БДУ; падрыхтоўка ваенных дыпламатаў на ваенным факультэце БДУ; пра ўрокі ў Ліцэі БДУ, які вядзе прафесар, палкоўнік у адстаўцы Валерый Беспразванны (25.09).

"Региональная газета" – III Міжнародная канферэнцыя "Азёрныя экасістэмы: біялагічныя працэсы, антрапагенная трансфармацыя, якасць вады" (21.09).

БелаПАН – адкрыццё Кітайска-беларускага цэнтра міжкультурнай камунікацыі на базе Далянскага палітэхнічнага універсітэта паводле пагаднення паміж БДУ і гэтым кітайскім універсітэтам (17.09); мемарандум паміж БДУ і Джэцзянскім акіянічным універсітэтам (21.09); прэм'ера спектакля "Сляпая зорка" тэатра "На балконе" БДУ (22.09); Міжнародны тэатральны фестываль "Тэатральны куфар" (07.10); XI Міжнародная асамблея рэктараў славянскіх універсітэтаў у БДУ (09.10); сустрэча рэктара БДУ з нагоды Дня маці са студэнткамі і аспіранткамі, якія маюць дзяцей; дамова пра супрацоўніцтва паміж БДУ і Македонскім універсітэтам Св. Кірылы і Мяфодзія (10.10).

БелТА – фестываль студэнцкай творчасці БДУ; біяхімічныя рэагенты для маркіроўкі і ідэнтыфікацыі каштоўных папер і дакументаў, распрацаваныя на біяфаку БДУ; сумесныя навуковыя даследаванні ў галіне машынабудавання вучоных НІІ ФХП БДУ і Карэйскага інстытута машынабудавання і матэрыялаў (19.09); комплекс захадаў для прагназавання геафізічных катастроф, распрацаваны вучонымі НДІ ПФП БДУ (18.09); адкрыццё Кітайска-беларускага цэнтра міжкультурнай камунікацыі на базе Далянскага палітэхнічнага універсітэта паводле пагаднення паміж БДУ і гэтым кітайскім універсітэтам (17.09); ветпрэпараты на аснове мікраэлементаў, створаныя вучонымі БДУ і Віцебскай ветэрынарнай акадэміяй (21.09); Міжнародны тэатральны фестываль "Тэатральны куфар" (24.09, 25.09, 01.10, 06.10); узнагароджанне лепшых студатрадаў БДУ (25.09); кубак сярод бібліятэкараў па інфармацыйным пошуку ў інтэрнэце, фінал якога пройдзе ў Фундаментальнай бібліятэцы БДУ (26.09); пра метэарытныя і зорныя дажджы расказваюць у абсерваторыі БДУ (01.10.); Міжнародная навуковая канферэнцыя "Матэматычнае мадэляванне і дыферэнцыяльныя ўраўненні" (01.10); прыбор "Мас-1", распрацаваны вучонымі БДУ (03.10); XI Міжнародная асамблея рэктараў славянскіх універсітэтаў у БДУ (04.10, 09.10); сустрэча рэктара БДУ з нагоды Дня маці са студэнткамі і аспіранткамі, якія маюць дзяцей (09.10); узнагароды за навуковыя распрацоўкі вучоных БДУ на выставе-кангрэсе ў Санкт-Пецярбургу "Высокія тэхналогіі. Інавацыі. Інвестыцыі"; дамова пра супрацоўніцтва паміж БДУ і Македонскім універсітэтам Св. Кірылы і Мяфодзія (10.10).

"7 дней" – комплекс захадаў для прагназавання геафізічных катастроф, распрацаваны вучонымі НДІ ПФП БДУ (20.09).

"Репетитор" – матэрыял пра абсерваторыю БДУ (№ 8, 2007).

Пра гэтыя і іншыя падзеі паведамлялася таксама на беларускіх тэле- і радыёканалах.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

ПАРТНЁРСТВА

МЕМАРАНДУМ АБ УЗАЕМАРАЗУМЕННІ

Мемарандум аб узаемаразуменні падпісаны 20 верасня ў Мінску паміж БДУ і Джэцзянскім акіянічным (КНР) універсітэтамі. Гэты дакумент прадугледжвае абмен студэнтамі і вучонымі і дзейнічае ў рамках пагаднення паміж дзвюма ВНУ ад 7 ліпеня 2006 года.

У адпаведнасці з Мемарандумам аб узаемаразуменні, пачынаючы з 2008 года, па шэрагу спецыяльнасцяў, якім навучаюць у абодвух універсітэтах, штогод будуць накіроўвацца 5-10 лепшых студэнтаў II курса на тры гады для далейшай вучобы ў ВНУ-партнёры. Па заканчэнні вучобы бакі абавязаны выдаць дыплом аб вышэйшай адукацыі (з прысваенням ступені бакалаўра).

Калі ж кітайскія студэнты паспяхова здадуць экзамены, яны змогуць працягнуць навучанне ў магістратуры БДУ. Апошні пункт тычыцца таксама і 501-го студэнта-першакурсніка з Джэцзянскага акіянічнага універсітэта, якіх гэтая ВНУ абавязваецца штогадова адпраўляць на 4 гады навучання ў БДУ.

Бакі дамовіліся таксама аб арганізацыі ўзаемных стажыровак і моўнай падрыхтоўкі выкладчыкаў.

Акрамя таго, кітайскія партнёры выказалі вялікую зацікаўленасць у пашырэнні супрацоўніцтва ў навуковай сферы.

Паводле інфармацыі ўпраўлення міжнародных сувязяў

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

ПАЎСТАГОДДЗЯ НА "ЦВЁРДЫХ" ПАЗІЦЫЯХ

19 кастрычніка на фізічным факультэце будзе адзначана 50-годдзе кафедры цвёрдага цела. Ва ўрачыстым пасяджэнні возьмуць удзел выкладчыкі і выпускнікі кафедры – супрацоўнікі БДУ, іншых ВНУ, а таксама Нацыянальнай акадэміі навук.

Кафедра фізікі цвёрдага цела была створана ў БДУ ў 1957 годзе з мэтай падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне фізічнага матэрыялазнаўства для прамысловасці і навукі рэспублікі. Яе першым кіраўніком стаў вядомы вучоны, акадэмік АНБ Мікалай Сірата. Навуковыя праблемы, вызначаныя ім, тычыліся даследаванняў хімічнай сувязі, фазавых і структурных пераўтварэнняў у крышталях, іх уплыву на фізічныя якасці матэрыялаў. З 1961 года кафедру ўзначаліў прафесар Мікалай Кунін, пад кіраўніцтвам якога выкананы сістэматычныя даследаванні ўплыву пластычнай дэфармацыі на структуру і якасці металаў і паўметалаў. Дацэнт Ганна Шыбаева, якая ўзначальвала кафедру ў 1968–1969 гг., прыклала шмат намаганняў для ўмацавання кадравага складу. З 1969 года на кафедры пад кіраўніцтвам дацэнта Георгія Гуманскага пачалі вывучацца структурна-фазавыя пераўтварэнні пры іоннай імплантацыі. Пад кіраўніцтвам загадчыка кафедры прафесара Усевалада Гольцава з 1980 г. па 1990 г. пачалі актыўна развівацца даследаванні ўплыву іонна-плазменнай апрацоўкі паверхні металаў і распрацоўвацца вымяральныя ператваральнікі. У гэты час пры кафедры былі створаны НДЛ "Фізіка іонна-плазменнай мадыфікацыі цвёрдых цел" і "Цвёрдацельныя пераўтваральнікі робататэхнічных сістэм". За цыкл навуковых работ і ўкараненне атрыманых вынікаў прафесар Гольцаў у 1986 годзе ўдастоены Дзяржаўнай прэміі БССР, а аспіранту кафедры Міхаілу Гольцаву прысуджана прэмія Ленінскага камсамолу Беларусі. Ужо ў 2001 годзе супрацоўнікам кафедры В.Углову, У.Панарадаву, В.Хадасевічу і С.Жукавай прысуджана прэмія імя А.Н. Сеўчанкі.

З 1990 года па сёння кафедрай кіруе прафесар Віктар Анішчык. У гэты перыяд актыўна развіваюцца даследаванні па атрыманні і апрацоўцы матэрыялаў нетрадыцыйнымі тэхналогіямі.

За 50 год кафедрай падрыхтавана каля 2000 дыпламаваных спецыялістаў, 100 кандыдатаў навук і 5 дактароў навук. Выкладчыкі кафедры забяспечваюць падрыхтоўку па спецыялізацыях "Фізіка цвёрдага цела", "Радыяцыйнае матэрыялазнаўства", "Вакуумныя тэхналогіі", а таксама чытаюць шэраг агульнафакультэцкіх лекцыйных курсаў.

Прафесар Васіль ШАПЯЛЕВІЧ

СТУДЭНЦКІ МЕРЫДЫЯН

"ЭРАЗМУС МУНДУС" — ЕЎРАПЕЙСКАЯ АДУКАЦЫЯ ДЛЯ БЕЛАРУСКІХ СТУДЭНТАЎ

Ці не кожны студэнт жадаў бы павучыцца пэўны час за мяжой, каб удасканаліць свае прафесійныя і моўныя навыкі, пашырыць кругагляд? Вучоба ў Белдзяржуніверсітэце адкрывае такія магчымасці.

Іспанія, Партугалія, Італія, Польшча сталі месцам працягу навучання для пераможцаў першага этапу праграмы "Эразмус Мундус", які ажыццявіўся ў жніўні. Некаторыя "шчасліўцы" ўжо адправіліся за новымі ўражаннямі і ведамі, а хтосьці яшчэ пакуе чамаданы. Між тым прыём заяў на ўдзел у другім этапе "Эразмус Мундус" – праграме паслядыпломнай адукацыі – працягваецца.

"Эразмус Мундус" – праграма кааперацыі і мабільнасці ў сферы вышэйшай адукацыі. Для Беларусі, у адрозненне ад краін Заходняй Еўропы, гэты праект – навінка. Ён рэалізуецца з 2007 года толькі ў БДУ і Брэсцкім дзяржуніверсітэце. Каардынуючы цэнтр знаходзіцца ў іспанскім універсітэце Дэусто (Більбао). Галоўная мэта праграмы – умацаванне еўрапейскага супрацоўніцтва і міжнародных адукацыйных сувязяў, культурнае ўзбагачэнне ўдзельнікаў.

Паводле ўмоў праграмы студэнты, магістранты і аспіранты могуць прайсці навучанне па спецыяльнасці ў іншых краінах тэрмінам ад 10-ці месяцаў да 3-х гадоў. Таксама прадугледжаны спецыяльныя праграмы для выкладчыкаў і нават для грамадскіх арганізацый. Каб стаць іх удзельнікам, трэба, як правіла, вучыцца ці працаваць у той адукацыйнай установе, што з'яўляецца членам кансорцыума навучальных устаноў. Кансорцыум – часовае пагадненне розных ВНУ для рэалізацыі сумеснага праекту. Напрыклад, наш універсітэт уваходзіць у аб'яднане, у складзе якога 19 вышэйшых навучальных устаноў з 13-ці краін свету.

Рэгіструюцца ўдзельнікі праз інтэрнэт. На сайце універсітэта-каардынатара кандыдат запаўняе анкету на англійскай мове, а копію адсылае ва ўпраўленне міжнародных сувязяў БДУ. Затым члены кансорцыума разглядаюць усе анкеты, сярод якіх вызначаюць найбольш адпаведныя. Спісы пераможцаў – атрымальнікаў грантаў накіроўваюцца ў Еўрапейскую камісію, што забяспечвае фінансаванне праекта. Сюды ўваходзяць: выплата штомесячнай стыпендыі, транспартныя расходы і выдаткі на жыллё. Сёлетні адбор удзельнікаў прайшоў у Кіеве, куды, па словах начальніка аддзела ўпраўлення міжнародных сувязяў Вольгі Карапецян, з'ехаліся прадстаўнікі ўсіх універсітэтаў-партнёраў. Асноўным крытэрыем годнасці кандыдата была паспяховасць. Далей улічваліся яго матывацыя і веданне замежнай мовы. Акрамя таго, меўся на ўвазе пагоджаны спіс прыярытэтных спецыяльнасцяў. У выніку, з 70-ці заяў ад БДУ было адабрана 10 чалавек. Гэта студэнты ФФСН, а таксама юрыдычнага, геаграфічнага і эканамічнага факультэтаў. Беларускія студэнты былі запрошаны універсітэтамі Італіі, Іспаніі, Польшчы і Партугаліі для навучання на працягу аднаго акадэмічнага года. Дарэчы, важны аспект праграмы ў тым, што пройдзены курс навучання (і атрыманыя адзнакі) павінны залічвацца студэнтам БДУ ў максімальна магчымым аб'ёме.

Паколькі "Эразмус Мундус" – гэта праграма двухбаковага абмену, магчыма, на пачатку другога семестра на вучобу ў Белдзяржуніверсітэт прыедзе група студэнтаў з еўрапейскіх ВНУ. Літва ўжо выказала жаданне прыслаць да нас сваіх рускамоўных навучэнцаў. Шчыра запрашаем!

Зразумела, што асаблівасці чужаземнай адукацыі ўсе стыпендыяты мусяць спасцігаць на замежнай мове. Каб як след падрыхтавацца, яны за месяц да пачатку заняткаў выпраўляюцца ў краіны-адрасаты, дзе ім прапануецца інтэнсіўны моўны курс.

Прынамсі, група ажно з 5-ці студэнтаў ФФСН нашага універсітэта будзе вучыцца ў Акадэміі Гейштара (Польшча). Адна з навучэнак - студэнтка IV курса Наталля Кавалеўская – упэўненая ў сваім веданні польскай мовы, якую пачала вывучаць яшчэ ў БДУ. 15 верасня дзяўчына адправілася на новае месца вучобы, але перад гэтым падзялілася з намі сваімі ўражаннямі: "Для мяне перамога ў такім прэстыжным конкурсе была сапраўды нечаканай. Тым болей што я ўдзельнічала ў міжнароднай праграме ўпершыню. Спадзяюся правесці гэтыя 10 месяцаў з карысцю для сваёй будучай прафесіі. Цяжкасцяў не баюся: разлічваю здаць усе іспыты ў БДУ экстэрнам і перайсці ў канцы года на пяты курс".

Студэнтка IV курса юрыдычнага факультэта Тамара Сакольчык ужо знаходзіцца ў іспанскім горадзе Більбао, дзе рыхтуецца да вучобы ў тамтэйшым універсітэце. Напярэдадні ад'езду яна вельмі хвалявалася, бо за мяжой будзе сам-насам. Праўда, па яе словах, яна ўжо паспела пазнаёміцца з некаторымі стыпендыятамі ад Украіны, якія складуць ёй кампанію. "Трэба шчыра прызнацца, што іспанскую мову я ведаю недастаткова добра, – зазначыла Тамара. – Аднак за вучобу не перажываю: усе лекцыі і заняткі будуць праходзіць на ангельскай мове, якой я валодаю свабодна. Адзінае, што засмучае, – у Більбао людзі размаўляюць на баскскай гаворцы, вельмі адрозныя ад сучаснай іспанскай мовы, што будзе таксама нам выкладацца. Тым не менш, я вельмі рада сваёй перамозе ў гэтай праграме і магчымасці цэлы год вучыцца ў Іспаніі. Дарэчы, на сесію я буду вяртацца ў родны універсітэт і здаваць экзамены разам са сваімі аднакурснікамі".

Праграма будзе дзейнічаць пакуль 3 гады. Гэта значыць, што тыя, хто не паспеў прыняць удзел у ёй сёлета, змогуць гэта зрабіць у наступным годзе. А вось аспіранты і дактаранты яшчэ да 22-га кастрычніка маюць права падаваць заявы на праграму паслядыпломнай адукацыі "Эразмус Мундус". Дадатковую інфармацыю можна знайсці на сайце універсітэта Дэусто (Іспанія) http://www.relint.deusto.es.

Надзея КЛЕМЯНЦЁНАК

ПАДПІСКА–2007

"ВЕСНІК БДУ"

Пачалася падпіска на перыядычныя выданні на першае паўгоддзе 2008 года.

Падпісная цана на часопіс "Веснік БДУ" па серыях:

Серыя I – фізіка, матэматыка, інфарматыка (№ 1, студзень; № 2, май): індывідуальная (індэкс 74851) – 22 030 р. (Белпошта), 20 430 р. (Белсаюздрук); ведамасная (індэкс 748512) – 64 395 р. (Белпошта), 60 233 р. (Белсаюздрук).

Серыя II – хімія, біялогія, геаграфія (№ 1, люты; № 2, чэрвень): індывідуальная (індэкс 74852) – 22 030 р. (Белпошта), 20 430 р. (Белсаюздрук); ведамасная (індэкс 748512) – 64 395 р. (Белпошта), 60 233 р. (Белсаюздрук).

Серыя III – гісторыя, філасофія, псіхалогія, паліталогія, сацыялогія, эканоміка, права (№ 1, сакавік): індывідуальная (індэкс 74853) – 11 020 р. (Белпошта), 10 220 р. (Белсаюздрук); ведамасная (індэкс 748532) – 32 197 р. (Белпошта), 30 120 р. (Белсаюздрук).

Серыя IV – філалогія, журналістыка, педагогіка (№ 2, красавік): індывідуальная (індэкс 74854) – 11 020 р. (Белпошта), 10 220 р. (Белсаюздрук); ведамасная (індэкс 748532) – 32 197 р. (Белпошта), 30 120 р. (Белсаюздрук).

Падпісацца на часопіс "Веснік БДУ" можна ва ўсіх аддзяленнях сувязі Рэспублікі Беларусь.

Часопіс "Веснік БДУ" ўсіх чатырох серый можна набыць у кіёску галоўнага корпуса БДУ (пр. Незалежнасці, 4), серыю III – у кіёску "Універсітэцкая кніга" (вул. Ленінградская, 8).

Самы танны і надзейны спосаб атрымаць часопіс – гэта падпіска.

ЧАСОПІС ДЛЯ САЦЫЁЛАГАЎ

Навукова-тэарэтычны часопіс "Социология" —

першае ў Рэспубліцы Беларусь перыядычнае выданне па пытаннях сацыялогіі. У ліку аўтараў часопіса – вядучыя сацыёлагі Беларусі, Расіі, Украіны, іншых краінаў СНД, а таксама ЗША, Германіі, Вялікабрытаніі, Аўстрыі, Польшчы і інш.

Часопіс уключаны Прэзідыумам ВАК Беларусі ў шэраг выданняў для публікацыі матэрыялаў пры абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый.

Часопіс разлічаны на чытачоў, якія спецыялізуюцца ў галіне сацыялогіі, а таксама сумежных галінах навукі: выкладчыкаў, навуковых супрацоўнікаў, аспірантаў, студэнтаў, спецыялістаў-практыкаў.

Перыядычнасць выхаду часопіса — 1 раз у квартал.

Кошт падпіскі на навукова-тэарэтычны часопіс "Социология" на першае паўгоддзе 2008 года складае:

для індывідуальных падпісчыкаў — 28 940 р. (кошт аднаго нумара 14 470 р.). Падпісны індэкс — 74932;

для ведамаснай падпіскі — 66082р. (кошт аднаго нумара 33 041 р.). Падпісны індэкс — 749322.

Падпісацца на часопіс "Социология" можна ва ўсіх аддзяленнях сувязі РА "Белпошта" Рэспублікі Беларусь ("Каталог газет і часопісаў Рэспублікі Беларусь на 1-е паўгоддзе 2008 года").

ДОБРАЯ СПРАВА

"ПРАЦОЎНАЕ ЛЕТА-2007" У БДУ ЗАВЕРШАНА

Урачыстае закрыццё трэцяга працоўнага семестра БДУ адбылося 3 кастрычніка ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Студэнты-пераможцы з узнагародамі за выдатную працу

Абранае месца сімвалічнае, паколькі нашы студэнты спрычыніліся ў свой час і да ўзвядзення знакамітага ўжо будынка-дыямента.

Сёлета студэнты універсітэта будавалі кінатэатр "Беларусь", спартыўна-культурны комплекс "Мінск-Арэна", спарткомплекс "Універсітэцкі" і адзін з карпусоў БНТУ, дзе паказалі сябе з лепшага боку. Увогуле да працы было прыцягнута каля 1000 чалавек, сфарміравана 5 будаўнічых атрадаў, па 2 педагагічных і валанцёрскіх, сельскагаспадарчы, экалагічны (уборка тэрыторыі музея ў Вязынцы) і сэрвісны (работа ў грамадскай прыёмнай камісіі) атрады. У індывідуальным парадку праз Студэнцкі цэнтр занятасці БРСМ БДУ працаўладкавана каля 300 юнакоў і дзяўчат.

Акрамя таго, у Студэнцкім гарадку БДУ ўвесь ліпень працавалі дабраахвотнікі па ўпарадкаванні і падрыхтоўцы інтэрнатаў да новага навучальнага года.

У выніку найлепшымі былі вызначаныя атрад "Вымпел" і атрад інтэрната № 10, якія атрымалі прыгожыя кубкі. 18 юнакоў і дзяўчат за вялікі асабісты ўклад у арганізацыю трэцяга працоўнага семестра былі ўзнагароджаны граматамі БДУ і памятнымі падарункамі. Іх уручыў рэктар прафесар Васіль Стражаў – у мінулым таксама ўдзельнік гэткіх акцый. Шмат добрых слоў сказалі і ветэраны студатрадаўскага руху – цяперашнія выкладчыкі універсітэта, якіх запрасілі на мерапрыемства ў якасці ганаровых гасцей. Да віншаванняў пераможцаў і ўсіх астатніх далучыўся і першы сакратар Мінскага гарадскога камітэта БРСМ Вадзім Гігін.

Напрыканцы ўдзельнікам быў прадэманстраваны фільм "Працоўнае лета–2007", які быў зняты відэастудыяй Студгарадка "SVS".

Затым усіх чакала займальная экскурсія па Нацыянальнай бібліятэцы з наведваннем аглядной пляцоўкі.

Ганна ЛАГУН

Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

ШКОЛА АКТЫВУ

МОЛАДЗЬ СВЯТКУЕ

25–26 верасня 2007 года ў САК "Брыганціна" прайшоў выязны семінар-практыкум, прысвечаны 5-годдзю БРСМ БДУ.

У ім прынялі ўдзел каля 100 чалавек: гэта і студэнцкі актыў пярвічнай арганізацыі БРСМ БДУ, і госці, у ліку якіх першы сакратар Мінскага гарадскога камітэта БРСМ Вадзім Гігін, а таксама прадстаўнікі іншых маладзёжных арганізацый універсітэта, удзельнікі будатрадаўскага руху. У рамках семінара былі праведзены дзве секцыі па тэмах: "Сучасныя мадэлі ўдзелу моладзі ў кіраванні дзяржавай" і "Дыскусійны клуб «Моладзь сёння»".

Напрыканцы студэнты і выпускнікі універсітэта зладзілі "Спартландыю". Намеснік сакратара БРСМ БДУ Ганна Холад адзначыла, што гэтыя 5 гадоў былі перыядам "новага і цікавага, сяброўскіх зносін, дапамогі адзін аднаму, сумесных вялікіх, адказных, карысных, прыемных і займальных спраў".

Упраўленне выхаваўчай работы з моладдзю праводзіць сярод студэнтаў і аспірантаў штогадовы **конкурс "Найлепшы маладзёжны праект"**. Заяўкі прымаюцца да канца кастрычніка 2007 года. Праекты ацэньваюцца па наступных крытэрыях: мэты, задачы і актуальнасць, вынікі, якія могуць быць атрыманыя пры рэалізацыі, карыснасць ідэй для БДУ, публікацыі аўтараў па тэматыцы праекта, наяўнасць грамат, дыпломаў, прэмій па заяўленай тэматыцы праекта.

Дадатковую інфармацыю можна атрымаць па адрасе: праспект Незалежнасці, 4, каб. 205, тэл. 209-52-61.

ВЕДАЙ НАШЫХ!

ФПМІ НА ПЕРАМОЖНЫМ ШЛЯХУ!

30 верасня прайшлі віртуальныя спаборніцтвы Адкрытай алімпіяды БДУ па праграмаванні сярод студэнтаў.

Гэты турнір з'яўляецца адным з этапаў адбору (1/8 фіналу) для далейшага ўдзелу ў Чэмпіянаце свету па праграмаванні. У алімпіядзе ўдзельнічалі 25 каманд нашага універсітэта: 14 – факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, 5 – механіка-матэматычнага факультэта, 3 – хімічнага факультэта і 3 – Ліцэя БДУ.

Алімпіяда насіла адкрыты характар. Паралельна з асноўным конкурсам праз інтэрнэт у ёй маглі ўдзельнічаць каманды з усёй постсавецкай прасторы, – ўсяго болей за 230-ць каманд з Расіі, Украіны, Казахстана, Латвіі, Грузіі і іншых краін, а таксама некаторых айчынных ВНУ. Урэшце, найлепшы вынік паказала каманда ФПМІ БДУ ў складзе Паўла Іржаўскага, Уладзіміра Керуса і Мікіты Леснікова. Нашы студэнты рашылі дзевяць задач з дзевяці прапанаваных. Такім чынам, упершыню за тры гады існавання турніру камандзе БДУ ўдалося абыграць калектывы з Масквы і Санкт-Пецярбургу, прызнаных лідараў падобных спаборніцтваў.

Акрамя таго, дзве каманды ФПМІ рашылі 8 задач і дзве другія – 6. У выніку ўсе яны будуць прадстаўляць БДУ на Дзесятых юбілейных чвэрцьфінальных спаборніцтвах Чэмпіянату свету па праграмаванні, якія адбудуцца з 24 па 27 кастрычніка 2007 года ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Сюды з'едуцца прадстаўнікі ВНУ Беларусі, Латвіі, Літвы, Эстоніі, Калінінградскай вобласці Расійскай Федэрацыі. Пераможцы атрымаюць права абараняць наш Заходні рэгіён на паўфінальных спаборніцтвах, якія пройдуць 28 лістапада ў Санкт-Пецярбургу. І толькі найлепшыя паўфіналісты змогуць паехаць на фінальныя спаборніцтвы, што адбудуцца ў г. Альберта (Канада) у красавіку 2008 года.

Кацярына ПАЗЮРА

УНІВЕРСІТЭТ

17 кастрычніка 2007 года, № 15-16 (1966-1967)

У ВОЛЬНЫ ЧАС

У ВІРЫ ТЭАТРАЛЬНАГА ЖЫЦЦЯ

Чацвёрты год запар упраўленне па справах культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта ладзіць сапраўднае свята для аматараў і прыхільнікаў Мельпамены. 16 спектакляў — 16 поглядаў на сучаснае тэатральнае мастацтва прадэманстравала мінскім гледачам творчая моладзь з сямі краін свету на "Тэатральным куфры–2007", які прайшоў у Мінску з 1 па 6 кастрычніка.

На жаль, у гэтым годзе ўжо любімы і звычны "Трамвай жаданняў" не абвясціў горад пра пачатак фестывалю. А ўсё з-за рамонту рэек. Таму арганізатары прыдумалі іншую "фішку". Яны вырашылі, што "Куфар" – зусім не горшы за фестывалі ў Канах ці Галівудзе, і зрабілі сваю "зорную дарогу". Толькі не чырвонай, а срэбнай дарожкай пад апладысменты і ўспышкі фотакамер узыходзілі па лесвіцы Палаца прафсаюзаў калектывы-ўдзельнікі падчас адкрыцця мерапрыемства.

Тэатр без межаў

Сёлета фестываль адкрыў гледачам шмат новых імёнаў. Сем мінскіх калектываў – рэкордная колькасць для "Куфра", – трупы з Расіі, Эстоніі, Латвіі, Бельгіі, Балгарыі, Швейцарыі. Толькі заяўленая тэатральная школа з Бразіліі з-за фінансавых праблем не здолела прыехаць у Мінск.

Не пабачылі гледачы і некаторых айчынных выбітных калектываў – тэатраў "На філфаке" (БДУ), "Пілігрым" (Полацк) і "Арт" (Наваполацк). І віной таму не "падкопы" аргкамітэта – нікога не "адсеялі" пры адборы. Ёсць Палажэнне, згодна з якім удзельнічаць у фестывалі дазваляецца не больш двух разоў запар – каб рэпертуар аднавіць і даць магчымасць іншым тэатрам праявіць сябе.

Праграма "Куфра", як заўсёды, была вельмі насычаная. Калі гледачы толькі і паспявалі, што бегаць з адной пляцоўкі на іншую, бо ў дзень дэманстравалася па 3–4 спектаклі, то самі акторы яшчэ ўдзельнічалі і ў майстар-класах. Тут яны размаўлялі пра духоўнасць, медытавалі, вучыліся рэлаксацыі і абстрагаванню перад выхадам на сцэну, знаёміліся з асновамі рэжысуры, імправізавалі.

Дэвіз "Тэатральнага куфра" – "Традыцыі. Пошук. Эксперымент" – пацвярджаецца штогод разнастайнасцю пастановак. Тут і класіка (Ф.Дастаеўскі, Ул.Салагуб), і сучасныя аўтары (М.Рудкоўскі, А.Курэйчык), і нават тэатр абсурду (Э.Олбі). Цяжка адзначыць якую-небудзь агульную асаблівасць студэнцкіх тэатраў. На самой справе яны вельмі розныя, як само жыццё. Моладзь не баіцца эксперыменту. Так, калектыў са Швейцарыі аб'яднаў тэатр і кіно. Трупа з Кемерава (Расія) трох персанажаў прадставіла чатырнаццацю акторамі.

Па срэбнай дарожцы да будучай славы

Агульны ўзровень удзельнікаў фестывалю быў даволі прафесійным. Дэманстравалася шмат цікавых і крэатыўных пастановак. Сустракаліся і аматарскія спектаклі. І гэта натуральна, бо "Куфар" адкрыты для ўсіх.

"Kufar-in-motion": уражвае колькасць актораў на сцэне

"Куфар" у руху

Фестываль развіваецца, пастаянна ў пошуку. Арганізатары штогод прыдумляюць займальныя праекты, новыя намінацыі.

Гэты год адзначаны дзвюма з'явамі – праектам тэатра on-line "Kufar-in-motion" і адкрыццём Фестывальнага клуба.

Усяго за 12 гадзін каля 30-ці ўдзельнікаў фестывалю пад кіраўніцтвам рэжысёра і актора Вольфганга Хэнча з Германіі стварылі арыгінальны імправізаваны спектакль, які паказалі на цырыманіі закрыцця "Куфра".

Другі праект – "Фестывальны клуб" – таксама прыцягнуў шмат увагі. Увесь тыдзень акторы, рэжысёры, члены журы і СМІ збіраліся ва ўтульнай кавярні "д'Ом". Уначы, пасля напружанага фестывальнага дня, тут знаёміліся, абмяркоўвалі пастаноўкі і проста адпачывалі.

Па іншы бок рампы

Большасцю гледачоў падчас спектакляў былі студэнты. Часам заходзіла кіраўніцтва ВНУ, ад якой выступала трупа, прадстаўнікі пасольстваў, астатнія тэатральныя калектывы. Заўзятыя тэатралы прыходзілі за гадзіну да спектакля, каб заняць месца, часам глядзелі стоячы альбо седзячы на прыступках, шчодра адорвалі апладысментамі актораў. Расчараванняў было няшмат. У асноўным яны тычыліся мовы пастановак, што прымушала некаторых заўчасна пакідаць залу. Таму пажадана, каб у наступным годзе арганізатары пазначалі ў праграмцы мову. Тады выбар наведвання таго ці іншага спектакля будзе больш усвядомлены.

Раздача слоноў

Можна доўга спрачацца, што мае большую каштоўнасць для студэнцкага тэатральнага калектыву – узнагарода ад прафесіяналаў ці гледачоў. "Куфар" у гэтым мае сваю перавагу: тут ацэньваюць пастаноўкі ўсе жадаючыя і, канешне, журы.

Як і ў мінулыя гады, гран-пры фестывалю – "вялікі" куфар – уручаўся па выніках галасавання гледачоў. Сёлета найлепшай стала тэатр-студыя "7 ЭТАЖ" Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў са спектаклем "Свінячыя выбрыкі" па п'есе беларускага аўтара А.Богдана. Пераможца інтэрнэт-галасавання, якое ўпершыню праводзілася ў гэтым годзе, – спектакль "Я кахаЮ" народнага літаратурнага тэатра "Жывое слова" БДПУ імя М.Танка. Прыз гэтаму калектыву – размяшчэнне яго сайта на партале tut.by.

Аўтарытэтнае міжнароднае журы прысудзіла большасць персанальных прызоў тэатрам з Масквы і Балгарыі. Яны насамрэч прывезлі вельмі арыгінальныя, прафесійныя і проста цікавыя пастаноўкі. Так, спектакль "Шчаслівы няўдачнік" (МДУ імя М.Ламаносава, Масква) атрымаў "маленькія" куфры за найлепшую рэжысуру, сцэнаграфію і мужчынскую ролю другога плану (Ягор Нікіцін – за ролю Шэрлака Холмса). Тэатр "Spirovite" за спектакль "Добры доктар" павёз у Балгарыю куфры "За найлепшую мужчынскую ролю" (пісьменнік у выкананні Марціна Лазарэўскага) і "Найлепшую жаночую ролю другога плану" (Марыя Мінчыва – за ролю актрысы). Нельга не адзначыць шыкоўна сыграную ролю сабакі Сільвіі ў выкананні Надзеі Жук з аднайменнага спектакля тэатра "Сатрап" (БНТУ, Беларусь), за якую дзяўчына атрымала куфар "Найлепшая жаночая роля".

Канешне, куфраў на ўсіх не хапае. Таму журы штогод прыдумляе спецыяльныя намінацыі. Рэжысёр тэатра БДУ "На балконе" М.Рудкоўскі атрымаў дыплом "За арыгінальнае ўвасабленне ўласнай драматургіі" ў спектаклі "Сляпая зорка". А тэатральнай майстэрні А.Курэйчыка (Ліцэй БДУ) уручылі дыплом "За арыгінальнае музычнае рашэнне" ў спектаклі "Ілюзіён".

Адну з наймацнейшых пастановак прадэманстраваў тэатр "Tartu" з Эстоніі. Матэрыял яны выбралі няпросты – "Бесаў" Ф.Дастаеўскага. Моцны акторскі састаў і арыгінальная сцэнаграфія прынеслі гэтаму калектыву спецприз "За лепшы спектакль" ад Акадэміі мастацтваў і старшыні журы, дэкана яе тэатральнага факультэта, Уладзіміра Мешчанчука.

І што далей?

А далей будзе пяты, знамянальны фестываль, да падрыхтоўкі якога ўжо прыступіў аргкамітэт. Чакаюцца прыемныя сюрпрызы. Вернецца "Трамвай жаданняў". Арганізатары паабяцалі запрасіць пераможцаў мінулых гадоў. А яшчэ... А што яшчэ – пабачым у наступным годзе.

Настасся ЮДЧЫЦ
Фота Аляксандра СНАПКА

НАВІНЫ СТУДГАРАДКА

З 4 па 10 кастрычніка праходзіла пяршынства па міні-футболе сярод зборных каманд інтэрнатаў, наладжанае па традыцыі Студэнцкім гарадком. У арганізацыі і правядзенні спаборніцтваў дапамагаў Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па футболе БДУ. Турнір сабраў 8 зборных каманд інтэрнатаў. У напружанай барацьбе перамагла каманда інтэрната № 1, замацаваўшы сваё леташняе лідарства, II месца ў каманды інтэрната № 10, III месца – за інтэрнатам № 4.

Па выніках спаборніцтваў найлепшым гульцом прызнаны Ілля Вішнеўскі, студэнт IV курса гістарычнага факультэта, найлепшым бамбардзірам – Сяргей Шукайла , студэнт II курса факультэта радыёфізікі і электронікі, найлепшым галкіперам – Зміцер Новікаў, студэнт III курса таго ж факультэта.

***

15 кастрычніка група студэнтаў-актывістаў Студэнцкага гарадка наведала музей Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь. Сёння фонды музея налічваюць болей за 20 тыс. прадметаў, у тым ліку унікальную калекцыю аблігацый, выставу скарбаў, манет і зліткаў, выпушчаных НБ РБ. Студэнты пазнаёміліся з гісторыяй грашовага абароту на тэрыторыі Беларусі з даўнейшых часоў і да нашых дзён.

***

У сярэдзіне кастрычніка на базе Белдзяржуніверсітэта прайшоў гарадскі семінар "Арганізацыя выхаваўчай работы ў інтэрнаце навучальнай установы сталіцы". Ён штогод ладзіцца ў той ВНУ, чый інтэрнат стаў пераможцам агляду-конкурсу "Найлепшы інтэрнат навучальнай установы г. Мінска". Нагадаем, што ў 2007 годзе такім аб'яўлены інтэрнат № 1 БДУ. Акрамя абмену досведам, падчас семінару адбылося ўзнагароджанне прызёраў і пераможцаў агляду-конкурсу. Таксама была зладжана экскурсія і святочная праграма, прысвечаная 55-годдзю інтэрната № 1.

***

5 гадоў гасцінна адчыняе свае дзверы для аматараў і знатакоў паэзіі, аўтарскай песні, тэатральнага і выяўленчага мастацтва літаратурна-музычная гасцёўня "Натхненне". За гэты час яна адкрыла мноства новых імёнаў студэнцкіх паэтаў і аўтараў-выканаўцаў, а яе гасцямі былі вядомыя беларускія пісьменнікі, рэжысёры і мастакі. Нязменным кіраўніком гасціннай з'яўляецца Галіна Махаева, якая запрашае ўсіх жадаючых 25 кастрычніка ў сталоўку інтэрната № 5 на святочнае пасяджэнне гасцёўні, прысвечанае круглай даце яе дзейнасці. Пачатак у 19.00.

Паводле інфармацыі Студгарадка

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

БЕРАЖЛІВАСЦЬ – НАШ АБАВЯЗАК

Бацькі з маленства выхоўваюць дзяцей так, каб яны шанавалі прыродныя рэсурсы, гэтаму ж вучаць і ў школе, універсітэце. Але многія з нас так і не займелі добрай звычкі берагчы ваду, электраэнергію, цяпло і газ.

Калі б кожны задумаўся і падлічыў, колькі літраў вады растрачвае ў дзень на ўсе патрэбы, то ён бы ашчадней выкарыстоўваў яе. Так, у сярэднім чалавек расходуе 300 літраў вады ў дзень, з іх 6–8 – на мыццё рук і столькі ж на чыстку зубоў. А колькі мы бяздумна губляем цяпла, калі не заклейваем вокны, палім электраэнергіі, калі ўключаем усе прыборы (і патрэбныя і не вельмі) адначасова! Падлікі непазбежна прыводзяць да несуцяшальных высноў.

Каб звярнуць на гэта ўвагу, Студэнцкі гарадок БДУ арганізаваў конкурс плакатаў "Эканомія і беражлівасць – унёсак кожнага". Студэнты, што жывуць у інтэрнатах, у вобразнай форме прапанавалі свае "рэцэпты" эканоміі і далучэння ўсіх жыхароў да вырашэння гэтай праблемы. Вось некаторыя з лозунгаў: "Берегите, люди, свет! Нам без света жизни нет!", "Твои стены боятся темноты? Или все-таки нет? Тогда не трать деньги, освещая пустые комнаты!", "Электричество – исчерпаемый ресурс. Любовь – неисчерпаемый. Экономьте с умом!"

Хочацца верыць, што такі зварот да ўсіх студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта паспрыяе разуменню таго, што ашчадны расход цяпла, электраэнергіі, прыроднага газу, вады і іншых рэсурсаў павінны стаць нормай жыцця для кожнага чалавека.

Юлія САНЬКО

З УСМЕШКАЙ

На іспыце па крымінальным праве:

– Ці можаце сказаць мне, што такое падман?

– Гэта адбудзецца, прафесар, калі Вы мяне заваліце.

– Якім чынам, патлумачце.

– Згодна з Крымінальным кодэксам, падман здзяйсняе той, хто карыстаецца няведаннем інфармацыі з боку другой асобы і наносіць ёй шкоду.

***

Дзяўчына прыходзіць на іспыт па літаратуры.

Экзаменатар:

– Прозвішча, імя?

– Калі не здам, то Ганна Карэніна.

***

Студэнт хныча:

– Прафесар, я не заслугоўваю двойкі!

– Ведаю, але ніжэйшых адзнак у нас, на жаль, няма!

***

Студэнт:

– Шкада, але на гэтае пытанне я не магу адказаць.

Выкладчык:

– Вы тое самае казалі і ў мінулы раз.

– Хіба я не стрымаў слова?

***

Выкладчык:

– Спадзяюся, малады чалавек, у гэты раз вы сур'ёзна падрыхтаваліся да іспыту?

Студэнт:

– Канешне, прафесар. Уяўляеце, я вучыў дзень і ноч.

Выкладчык:

– Дзень ... і ноч. Гэта я ўяўляю. Вось не ўяўляю іншага: што можно вывучыць за адны суткі?

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

17 кастрычніка 2007 года
Падпісана да друку 15.10.2007 г.
Зак. 994. Тыраж 2000 экз. Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Юлія ЛІТВІНАВА
Камп'ютарная вёрстка Аляксандра САЛАМАХІНА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, праспект Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Бабруйская, 7, п. 411, тэл. 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by